
ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

4



КАМЕННЫ ВЕК НА БЕЛАРУСІ



Самы
старажытны перыяд
у развіцці
чалавецтва.
Прылады працы
выраблялі з каменю
(крэменю).
На Беларусі
скончыўся ў пачатку
II тысячагоддзя
да н. э.

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ

Вучэбны дапаможнік для 4 класа
агульнаадукацыйнай школы
з беларускай і рускай мовамі навучання

Пад рэдакцыяй прафесара Г. В. Штыхава

2-е ВЫДАННЕ

Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Мінск «Народная асвета» 2002

УДК 94(476)(075.3=161.3=161.1)
ББК 63.3(4Беи)я72
Г46

Аўтары:

Г. В. Штыхаў, У. К. Пляшэвіч, В. У. Фядута, С. В. Паноў

Гісторыя Беларусі старажытных часоў: Вучэб. дапам. для 4-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. і рус. мовамі навучання / Г. В. Штыхаў, У. К. Пляшэвіч, В. У. Фядута, С. В. Паноў; Пад рэд. Г. В. Штыхава. — 2-е выд. — Мн.: Нар. асвета, 2002. — 110 с.: іл., карт.

Г46

ISBN 985-12-0548-6.

УДК 94(476)(075.3=161.3=161.1)
ББК 63.3(4Беи)я72

© Штыхаў Г. В., Пляшэвіч У. К.,
Фядута В. У., Паноў С. В., 2001
© УП «Народная асвета», 2001

ISBN 985-12-0548-6

Слова да вучняў

Юныя сябры! Вы трымаеце ў руках вучэбны дапаможнік «Гісторыя Беларусі старажытных часоў». Тут словы «старажытныя часы» азначаюць тое ж самае, што і «першабытныя часы» — найстаражытнейшы перыяд гісторыі чалавецтва. У дапаможніку выкладзена гісторыя першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі ад з'яўлення чалавека да перыяду Сярэдневякоўя.

Што адбывалася ў далёкім мінулым на зямлі, дзе мы з вамі жывём? Калі тут з'явіліся людзі? Як былі арганізаваны іх грамадства і праца? Ці мела свае асаблівасці жыццё старажытных людзей на тэрыторыі Беларусі?

На гэтыя пытанні дае адказ гісторыя Беларусі — навука, якая вывучае развіццё чалавечага грамадства ў мінулым на тэрыторыі нашай сучаснай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь. Ведайце гісторыю сваёй Бацькаўшчыны! Без гэтага немагчыма быць патрыётам сваёй зямлі.

Пачынаючы з гэтага вучэбнага дапаможніка, вы крок за крокам будзеце спасцігаць старонкі айчыннай гісторыі. Жадаем вам поспехаў у цікавай высакароднай справе!

Як карыстацца вучэбным дапаможнікам

Уважліва азнаёмцеся са структурай кнігі, яе зместам. Дапаможнік складаецца з раздзелаў, тэм і параграфаў. Раздзелы ахопліваюць пэўны адрэзак часу. Кожная тэма прысвечана зменам у жыцці старажытных людзей на тэрыторыі Беларусі, а параграф асвятляе пытанні, якія адпавядаюць яго назве. Для зручнасці чытання і складання плана параграфы падзелены на невялікія часткі, ці пункты.

Параграфы пачынаюцца з задання *«Успомніце»* і завяршаюцца пытаннямі да тэксту. Абавязкова адкажыце на кожнае з іх. Калі адказ не атрымаецца, звярніцеся яшчэ раз да тэксту параграфа, які вывучаеце, або папярэдняга.




Схема развіцця чалавека: ад малпы да «чалавека разумнага сучаснага»

Улічвайце, што ў тэксце ёсць словы, азначаныя ***тлустым*** шрыфтам. Гэта ключавыя словы — гістарычныя тэрміны і паняцці. Азнаямленне з імі і запамінанне дапаможа вам адказаць на пытанні. Гэтыя ж тэрміны знаходзяцца ў тлумачальным слоўніку ў канцы падручніка. Побач з кожным з іх пазначаны параграф, у якім тое ці іншае паняцце сустракаецца.

У кожным параграфе ёсць галоўная думка. Каб вылучыць яе, звярніце ўвагу на вывад, які змяшчаецца пасля невялікай працяглай рысачкі. Тое галоўнае, што вы прачытаеце ў тэксце, часта падаецца з дапамогай схем. Іх разуменне неабходна для таго, каб адказаць на пытанні да параграфаў і падагульняючага ўрока.

У падручніку ёсць малюнкі. Разгледзьце іх. Вызначце, што з прачытанага ў тэксце яны адлюстроўваюць. Складзіце апавяданне па кожнаму малюнку. Не абыходзьце ўвагай і карты. Гэта своеасаблівы компас у падарожжы па краіне нашых продкаў. Пры згадванні ў тэксце назвы населенага пункта або ракі абавязкова знайдзіце іх на карце.

Калі вас зацікавіла тая ці іншая падзея з жыцця старажытных жыхароў нашай краіны, звярніцеся у школьную бібліятэку. Адшукаць неабходную кніжку дапаможа спіс літаратуры для пазакласнага чытання. У ім даюцца невялікія каментарыі (характарыстыка) да кожнай

кнігі. Будзе вельмі карысна і цікава для вас, калі вы наведаеце краязнаўчы, гістарычны музеі. У іх абавязкова ёсць зала (аддзел), які дапоўніць і ўдакладніць вашы веды па гісторыі Беларусі старажытных часоў.

Правілы вывучэння гісторыі. Гісторыя першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі як навука аб жыцці нашых найстаражытнейшых продкаў адказвае на чатыры асноўныя пытанні: ш т о, д з е, к а л і, ч а м у адбылося? Адсюль вынікаюць чатыры правілы вывучэння гісторыі.

Правіла першае. Што адбылося? Усякая гістарычная падзея мае сваю назву. Неабходна імкнуцца зразумець назву, запомніць і ўмець яе растлумачыць. Звычайна ў тэксце яна выдзелена шрыфтам.

Правіла другое. Дзе адбылося? Кожная гістарычная падзея мае месца свайго ўзнікнення і межы распаўсюджання. Іх неабходна ведаць, каб не блукаць у прасторы. Дапамогуць вам гістарычныя карты, размешчаныя ў кнізе, а таксама атлас і контурныя карты.

Правіла трэцяе. Калі адбылося? Любая гістарычная падзея мае час свайго ўзнікнення, можа мець перыяд існавання. Усё гэта вызначаецца датамі. Цвёрда запомніць асноўныя даты вельмі неабходна, інакш можна згубіць арыенцір у часе. Дапаможа вам так званая «стужка часу», па якой можна навучыцца весці лік гадоў у



Раз'юшаная слонападобная жывёла — мамант

гісторыі. Асноўныя гістарычныя даты размешчаны ў канцы кнігі.

Правіла чацвёртае. Чаму адбылося? У гісторыі не бывае падзей, якія б не мелі сваіх прычын і вынікаў. Зразумець іх дапамогуць «лагічныя ланцужкі». Яны адлюстроўваюць заканамернасці развіцця чалавечага грамадства ў выглядзе пэўных схем. Падобна іншым навукам, гісторыя таксама мае свае законы.

Датаванне падзей


Успомніце: Што азначае слова «археалогія».

Адкуль ідзе адлік часу. Гістарычная навука немагчыма без выкарыстання дат. *Дата* — гэта час, калі адбылася падзея. Вы ўжо ведаеце, што вялікія адрэзкі часу лічаць з дапамогай гадоў. Сто гадоў складаюць ***стагоддзе*** (скарочана запісваецца *ст.*). Дзесяць стагоддзяў складаюць ***тысячагоддзе*** (скарочана — *тыс.*).

У розных краінах па-рознаму лічылі гады. Таму ў чалавецтва сёння не існуе адзінай кропкі адліку часу. У сучаснай сістэме летазлічэння, якой карыстаюцца краіны, дзе распаўсюджана хрысціянства (у тым ліку і мы), пачатковай датай лічыцца год нараджэння *Ісуса Хрыста.*

Нараджэнне Хрыста — гэта кропка адліку, момант, з якога вядзецца летазлічэнне і які мае назву ***эра.*** Лік гадоў вядуць ад першага года, у якім нарадзіўся Хрыстос. Тыя падзеі, што адбыліся пасля гэтай даты, уваходзяць у *нашу эру* (скарочана абазначаецца *н. э.* альбо ўвогуле не абазначаецца). Многія гістарычныя падзеі адбыліся да нараджэння Хрыста, гэта значыць *да нашай эры.* Яны запісваюцца *да н. э.*

«Стужка часу». Разгледзім сучаснае летазлічэнне з дапамогай «стужкі часу». На ёй год



нараджэння Ісуса Хрыста абазначаны літарамі «Р. Х.» (Ражство Хрыстова). Яго лічаць першым годам нашай эры, а рух часу разглядаюць злева направа (па накірунку стрэлкі), бо час рухаецца толькі наперад.

Гады да нашай эры прынята нумараваць у бок, процілеглы руху часу. Чым большая колькасць гадоў і стагоддзяў да нашай эры, тым падзея раней, старажытней, далей ад нашага часу, у якім мы жывём.

Гады і стагоддзі. Наша эра працягваецца ўжо дзве тысячы гадоў, альбо дваццаць стагоддзяў. Першае стагоддзе нашай эры пачынаецца з 1 г. і заканчваецца ў 100 г., другое — працягваецца са 101 г. па 200 г. і гэтак далей. Першае стагоддзе да нашай эры пачынаецца з 100 г. да н. э. і заканчваецца ў 1 г. да н. э., другое працягваецца з 200 г. да н. э. па 101 г. да н. э. і гэтак далей.

Пры вывучэнні курса «Мая Радзіма — Беларусь» вы даведаліся аб тым, як вызначыць, да якога стагоддзя адносіцца пэўная гістарычная дата і як стагоддзе абазначаецца арабскімі




Археалагічныя раскопкі. Расчыстка рэштак старажытнага вогнішча

і рымскімі лічбамі. Калі дата больш за тысячу, то да дзвюх першых лічбаў дадаём 1. Напрыклад, 1067 г. = 10 + 1 = 11 (XI) ст. Калі дата складае менш за тысячу, то адзінка прыбаўляецца да першай лічбы. Напрыклад, 862 г. = 8 + 1 = 9 (IX) ст. Гэтае правіла не тычыцца пачатковага году стагоддзя. Тут першая лічба ў трохзначнай даце ці першыя дзве лічбы ў чатырохзначнай даце абазначаюць стагоддзе: 800 г. = 8 (VIII) ст., 1500 г. = 15 (XV) ст.

Існуе яшчэ адзін спосаб. Дату трэба падзяліць на 100. Калі застаецца астатак, то да лічбы, якая атрымалася, дадаецца адзінка. Напрыклад: 862 : 100 (астатак 62). 8 + 1 = 9 стагоддзе. Калі ў астатку застаецца нуль, тады адзінка не дадаецца. Напрыклад: 800 год = 8 стагоддзе (800 : 100 = 8).

Лічэнне гадоў у гісторыі. Гісторыя першабытнага грамадства складае шмат тысячагоддзяў. Яе прынята падзяляць на тры вякі — *каменны, бронзавы* і *жалезны*. Такую гістарычную паслядоўнасць вучоныя называюць ***«сістэмай трох вякоў»***. Іх назвы звязаны з матэрыялам, што служыў нашым продкам для вытворчасці прылад працы.



Вы будзеце вывучаць гісторыю першабытных людзей, якія з'явіліся на тэрыторыі Беларусі прыкладна 26 тысяч гадоў назад. Як абазначыць гэтую дату на «стужцы часу»? Перш за ўсё звярніце ўвагу на словы ***«тысяч гадоў назад»***. Яны гавораць аб тым, што мы вызначаем час з таго моманту, у якім зараз жывём. Чалавецтва пражыло з году нараджэння Хрыста (у



Старажытныя людзі робяць прылады працы

нашай эры) 2 тысячы гадоў, таму менавіта гэтую лічбу трэба адняць ад даты са словамі «тысяч гадоў назад». Атрымаем дату, якая паказвае, за колькі тысяч гадоў да нашай эры адбы-

лася падзея. 26 тыс. гадоў назад будзе адпавядаць 24 тыс. гадоў да н. э.

Такім чынам, кропкай адліку часу лічыцца год нараджэння Хрыста (1 год н. э.). Падзеі, якія адбываліся да гэтага года, былі раней, чым пачалася наша эра, гэта значыць да нашай эры. Цяпер наша эра налічвае 2 тыс. гадоў. Адсюль вынікае, што 26 тыс. гадоў назад (ад нашых дзён) адпавядае часу 24 тыс. гадоў да н. э. І гэтак далей...


?

1. Што азначае тэрмін «сістэма трох вякоў»? Намалюйце ў сваіх сшытках «стужку часу» з вызначэннем гэтых вякоў. **2.** У чым асаблівасць датавання падзей на «стужцы часу» да нашай эры? **3.** Колькі гадоў і поўных стагоддзяў працягваецца наша эра? Калі яна пачалася? **4.** Што было раней: X ст. да н.э. альбо I ст. н.э.? **5.** Жалезны век на тэрыторыі Беларусі пачаўся каля VII ст. да н.э. Якімі з'яўляюцца пачатковая і канчатковая даты гэтага стагоддзя? **6.** Да якога стагоддзя адносяцца наступныя гады: 1040 г. да н.э., 1120 г., 1410 г., 865 г. да н.э., 1500 г., 1999 г. да н.э., 2001 г.? **7.** Пісьменнасць узнікла прыкладна 3 тыс. гадоў да н.э. Колькі гадоў назад гэта было? **8.** Даследаванні археолагаў на старажытным паселішчы сведчаць аб тым, што людзі пачалі жыць тут прыблізна 4 тыс. гадоў назад, а завяршылі — каля 500 г. да н.э. Колькі гадоў пражылі людзі на гэтым паселішчы? **9.** Да якога тысячагоддзя адносіцца 2001 год?

Раздзел I

ЖЫХАРЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАМЕННЫМ ВЕКУ





Тэма 1. НАЙСТАРАЖЫТНЕЙШЫЯ ЛЮДЗІ

§ 1. ПРАНІКНЕННЕ ЛЮДЗЕЙ НА ТЭРЫТОРЫЮ БЕЛАРУСІ

*Успомніце: **1.** Другое і трэцяе правілы вывучэння гісторыі. **2.** Калі на тэрыторыі Беларусі з'явіліся найстаражытнейшыя людзі?*

Абледзяненне і спробы пранікнення людзей. На працягу існавання Зямлі перыядычна адбываліся пахаладанні, утвараліся ***ледавікі.*** Таўшчыня лёду на поўначы Усходне-Еўрапейскай раўніны, уключаючы Беларусь, дасягала 2 кіламетраў.

Разрастанні ледавіка змяняліся яго адступленнямі. На абшары, з якога сходзілі ледавікі, утвараліся азёры, аднаўляліся рэкі. На ледавіковых адкладах выраставалі бярозавыя, асінавыя і яловыя лясы. Тут пасвіліся жывёлы. Яны прыстасоўваліся да халоднага клімату, які паступова цяплеў.

Але потым, праз шмат гадоў, з новым наступленнем ледавіка пачыналася новае пахаладанне. Зноў змяняўся раслінны і жывёльны свет. Здаралася, што холад і вечная мерзлата ахоплівалі нават поўдзень Беларусі.

Аднойчы халодны панцыр ледавіка сваім буйным языком ледзь не дасягнуў Чорнага мора. Тады пад лёдам апынулася ўся тэрыто-




Паўночныя алені, якія вадзіліся ў вялікай колькасці ў Беларусі і на якіх шмат палявалі ў тыя часы

рыя Беларусі. У астатніх выпадках ледавікі спыняліся на нашай зямлі.

Паступова найстаражытнейшыя людзі сталі рассяляцца на цёплым поўдні Еўропы. А на тэрыторыю Беларусі людзі праніклі пазней. Чаму ж так здарылася? З-за аддаленага геаграфічнага палажэння Беларусі. А таксама таму, што тэрыторыя Беларусі была пакрыта ледавіком.

Прылады працы. Найстаражытнейшыя людзі рабілі прылады працы з крэменю. ***Крэмень,*** як усялякі камень, належыць да карысных выкапняў, а ў Беларусі ёсць яго радовішчы. Крэмень лёгка расшчапляецца на вострыя кавалкі.

У канцы ледавіковага перыяду звычайнай прыладай працы былі ***востраканечнікі.*** Іх рабілі з кавалкаў крэменю. Адзін канец быў старанна завостраны. Процілеглы тупы канец служыў як бы ручкай. Востраканечнікам можна было лягчэй пракалоць і разрэзаць тоўстую скуру жывёлы. Ім можна было свідраваць адтуліны ў костках і драўніне. Часам востраканечнікі прымацоўваліся да палкі з дапамогай сухажылляў і смалы. Атрымліваліся прымітыўныя ***дзіды*** (коп'і).



Найстаражытнейшыя крамянёвыя прылады, якія знойдзены ў Беларусі: *а), б)* скрабкі; *в)* востраканечнік

Найстаражытнейшыя людзі выкарыстоўвалі таксама ***скрабкі*** — прылады працы для апрацоўкі скур. Адна з такіх прылад працы знойдзена каля вёскі *Свяцілавічы* Веткаўскага раёна на Гомельшчыне.

У той час сустракаліся прылады працы з дрэва і костак. Гэта драўляныя ***дубіны*** — палкі з патаўшчэннем на канцы. Такія прылады (даўбешкі) рабіліся і з костак буйных жывёл. «Чалавек разумны» мог вырабляць розныя прылады працы. Гэта дазваляла яму выжыць у суровых умовах прыледавіковай, амаль бязлеснай, зоны.

Пранікненне людзей на тэрыторыю Беларусі пачалося пазней, чым на поўдзень Еўропы. Яны карысталіся каменнымі прыладамі працы — востраканечнікамі і скрабкамі, якія неаднаразова былі знойдзены ў Беларусі. Час, калі асноўныя прылады працы рабіліся з каменю, называецца каменным векам.

? **1.** Якім было прыроднае асяроддзе ў час абледзянення? **2.** Разгледзьце малюнкі, змешчаныя ў гэтым параграфе, і апішыце аблічча найстаражытнейшых людзей. **3.** Пакажыце на карце, дзе былі знойдзены найбольш старажытныя прылады працы з крэменю ў Беларусі. **4.** Апішыце па малюнках прылады працы найстаражытнейшых людзей. **5.** Растлумачце, што такое *каменны век, ледавік, крэмень, востраканечнік, скрабок.*


§ 2. ПЕРШЫЯ СТАЯНКІ ЛЮДЗЕЙ І ІХ ПОБЫТ

Успомніце: 1. Чаму пранікненне людзей на тэрыторыю Беларусі адбылося пазней, чым на поўдзень Еўропы? 2. Якімі прыладамі працы карысталіся найстаражытнейшыя людзі?

«Чалавек разумны сучасны». Прыкладна **40—35 тыс. гадоў назад** на тэрыторыі Еўропы з'явіліся новыя людзі, якіх вучоныя называюць «чалавек разумны сучасны». Гэтыя людзі мелі тую ж форму чэрапа і ўсяго цела, як і сучасны чалавек. «Чалавек разумны» быў здольны разважаць, размаўляць і мэтанакіравана працаваць. Новыя людзі — нашы непасрэдныя продкі. Яны з'явіліся першапачаткова на поўдні Беларусі.

Чалавек навучыўся прыстасоўвацца да суровых умоў ледавіковай эпохі. Для пасялення ён выбіраў узвышаныя і цяжкадаступныя мясціны. Тагачаснага чалавека прываблівала блізкасць вады, багацце жывёльнага свету, сухі грунт для жылля. Яго цікавіла зручная для палявання мясцовасць.

Паселішчы і жыллё. Паселішчы людзей у Беларусі пераважна размяшчаліся на берагах буйных рэк — *Прыпяці, Дняпра, Сожа.* Месца пасялення першабытнага чалавека называюць ***стаянкай.***



«Чалавек разумны сучасны»

Доўгі час гісторыкі не ведалі, як выглядала самае старажытнае жыллё, зробленае рукамі чалавека. Аднак цяпер рэшткі старажытнага жылля знойдзены на многіх стаянках у Еўро-

пе і Азіі. У Беларусі такіх стаянак дзве. Самая старажытная стаянка чалавека каменнага веку знаходзіцца на Прыпяці каля вёскі *Юравічы* Калінкавіцкага раёна на Гомельшчыне. Яна існавала **24 тыс. гадоў да н.э.**

У той час уся навакольная тэрыторыя была амаль бязлеснай. Таму тагачасныя людзі пры пабудове жылля выкарыстоўвалі буйныя косткі мамантаў, іх чэрапы, іклы. У сярэдзіне жылля знаходзілася вогнішча, дзе гарэў агонь. Яно абкладвалася камянямі. Вогнішчы размяшчаліся і знадворку.

Другая стаянка адкрыта на беразе Сожа каля вёскі *Бердыж* Чачэрскага раёна. Тут людзі жылі




Выгляд жылля старажытных людзей (21 000 гадоў да н.э.)

21 тыс. гадоў да н.э. У Бердыжы выяўлены рэшткі двух паглыбленых у зямлю жыллёвых памяшканняў. Іх форма авальная, пасярэдзіне раскладвалася вогнішча.

Ніжнія часткі жылля людзі ўмацоўвалі чарапамі і іншымі буйнымі косткамі жывёл. Жыллё пакрывалася шкурамі жывёл. Яно было падобнае на ***будан*** (шалаш).

Побыт жыхароў. Крок за крокам паляпшаліся ўмовы жыцця старажытных людзей. Удасканаленне прылад працы спрыяла стварэнню запасаў ежы. Чалавек меў магчымасць больш працяглы час знаходзіцца на адным месцы.

Чалавек паступова навучыўся здабываць агонь з дапамогай трэння сухога дрэва. Гэтых спосабаў было некалькі. Адзін з іх — атрыманне агню з дапамогай хуткага свідравання.



Спосабы здабывання агню з дапамогай трэння сухога дрэва: скабленне, піленне, свідраванне



Старажытны спосаб здабывання агню, які яшчэ нядаўна ўжываўся некаторымі плямёнамі

На агні людзі пачалі гатаваць ежу.

Старажытным людзям станавілася жыць крыху лепш. Па падліках вучоных, калі раней да саракагадовага ўзросту дажываў толькі 1 чалавек са 100, то цяпер — 12. Але большасць людзей паміралі або гінулі, не пражыўшы 20 гадоў. Занадта небяспечнае было жыццё. Людзі гінулі заўчасна ад холаду, хвароб і няшчасных выпадкаў, ад ран, нанесеных дзікімі звярамі або ворагамі.

Ва ўмовах ледавіковай эпохі чалавек вымушаны быў будаваць сабе жыллё. На тэрыторыі Беларусі найбольш старажытныя стаянкі каменнага веку выяўлены каля вёсак Юравічы і Бердыж у Гомельскай вобласці.


? **1.** Колькі тысяч гадоў назад існавалі першыя стаянкі на тэрыторыі Беларусі? Якой будзе дата, што паказвае, колькі тысяч гадоў да н.э. існавалі гэтыя стаянкі? **2.** Якое значэнне ў жыцці старажытных жыхароў мела валоданне агнём? **3.** Апішыце старажытнае жыллё людзей каменнага веку на тэрыторыі Беларусі. **4.** Растлумачце, што такое *стаянка*. **5.** Раскажыце, чаму стаянкі першабытных людзей з'явіліся менавіта на поўдні і паўднёвым усходзе Беларусі.

§ 3. ЗАНЯТКІ СТАРАЖЫТНЫХ ЖЫХАРОЎ БЕЛАРУСІ

Успомніце: 1. Якую ролю адыгрывала паляванне ў жыцці найстаражытнейшых людзей? 2. На якіх звяроў яны палявалі?

Віды гаспадарчай дзейнасці. Для задавальнення сваіх патрэб чалавеку былі неабходны мяса, шкуры, косткі жывёл. Дзе іх узяць? У прыроды, у час палявання. ***Паляванне*** — гэта пошук і праследаванне дзікіх звяроў і птушак з мэтай іх здабычы.

З набліжэннем ледавіка многія цеплалюбівыя жывёлы вымерлі. На іх месца прыйшлі



Крамянёвыя прылады працы з Бердыжа: *а), б)* нажы; *в)* скрабок

шарсцістыя маманты і насарогі, алені, мядзведзі і інш. Нашы продкі былі ўжо тады здольнымі паляваць на буйных жывёл.

Марай паляўнічых стаў мамант. Гэта выкапнёвы слон, рэшткі якога цяпер знаходзяць у глыбокіх пластах зямлі. Ён быў вышынёй да трох метраў і меў закругленыя іклы-біўні.


Мамант для чалавека — крыніца вялікай колькасці мяса. Ён важыў некалькі тон. З костак маманта і яго магутных іклоў будавалі жыллё, якое накрывалі шкурамі. Косткі жывёл ішлі таксама на паліва. Выкапнёвыя маманты выяўлены ў Беларусі і нават у Мінску.

Зброяй нашаму продку служылі завостраныя палкі, камяні, драўляныя дубіны, крамянёвыя востраканечнікі. Пазней людзі сталі ўжы-

ваць колючую або кідальную зброю ў выглядзе доўгай палкі з вострым наканечнікам. Сёння яе называюць *дзідай,* ці кап'ём. Тады ж пачалі выкарыстоўваць і невялікае кап'ё — *дроцік.* З такой зброяй паляванне было магчыма пры непасрэдным сутыкненні са зверам.


Пасля адыходу ледавіка людзі пачалі займацца ***збіральніцтвам.*** Палкамі і вострымі камянямі выкопвалі карані і клубні, якія былі прыгодны для ежы.

Асноўны від збіральніцтва на Беларусі — нарыхтоўка лясных пладоў: ягад, грыбоў, лясных яблыкаў і груш, арэхаў, бярозавага соку.



Спосабы палявання. Прыёмы палявання былі разнастайнымі. Месцазнаходжанне звера выяўлялі па яго слядах. Добры вынік быў зімою, асабліва на першым снезе, а летам на вільготнай зямлі. *(Растлумачце чаму.)*


Найбольш пашыранай была *аблава з загонам,* якая бытуе і ў наш час. У мінулым загоншчыкі гналі жывёл у дрыгву, у глыбокія яры са стромкімі схіламі. Паляванне вялося



Паляванне на маманта: аблава з загонам у дрыгву

вялікімі групамі людзей. Ужываўся агонь для запалохвання звяроў. Загнаўшы магутнага звера ў балота або роў, людзі дабівалі яго там камянямі і дзідамі.

Паляванне было заснавана на веданні нораваў, звычак і паводзін звяроў. Людзі заўважылі, што алень вельмі цікаўны. Паляўнічыя пачалі прываблівaць яго надзетымі на галаву рагамі.





Паляванне першабытных людзей на мядзведзя

Так паўночныя народы палююць на аленя і ў наш час.

Прыродны падзел працы. Паляванне было справай мужчыны. Жанчына карміла дзіцё і несла яго на спіне. У такім стане яна не магла быць добрым памочнікам мужчыну на паляванні. Жанчына даглядала дзяцей, вяла хатнюю гаспадарку, падтрымлівала агонь у ачагу, займалася збіральніцтвам і рабіла яшчэ многае іншае.

Дзеці ўжо з маленства збіралі зерне, плады, дапамагалі дарослым.

Старыя людзі перадавалі маладым свой жыццёвы вопыт, захоўвалі тагачасныя звычаі і абрады.

Такім чынам, у каменным веку існаваў прыродны падзел працы паводле полу (паміж муж-

чынамі і жанчынамі) і паводле ўзросту (паміж дарослымі, дзецьмі і старымі).

Першымі заняткамі найстаражытнейшых жыхароў сталі паляванне і збіральніцтва. Гэтыя заняткі называюць відамі гаспадарчай дзейнасці. Пры вядзенні гаспадаркі сярод паляўнічых і збіральнікаў узнікае прыродны падзел працы паводле полу і ўзросту.

? **1.** Якімі былі спосабы палявання? **2.** На якіх звяроў палявалі? **3.** Складзіце апавяданне пра паляванне першабытных людзей. Выкарыстайце ілюстрацыі ў параграфе. **4.** Чаму менавіта паляванне было асноўным заняткам насельніцтва ў каменным веку? **5.** Растлумачце паняцці: *збіральніцтва, паляванне, прыродны падзел працы.* **6.** Як вы мяркуеце, чаму ўзнік падзел працы паміж старажытнымі людзьмі? Сваю думку растлумачце.


Тэма 2. ЖЫЦЦЁ СТАРАЖЫТНЫХ ЛЮДЗЕЙ У ПАСЛЯЛЕДАВІКОВЫ ПЕРЫЯД

§ 4. ПАСТУПОВАЕ ЗАСЯЛЕННЕ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*Успомніце: **1.** Які ўплыў мела пацяпленне на Зямлі на жыццё людзей у Еўропе? **2.** Для чаго людзі пачалі выкарыстоўваць дзіду і дроцік?*

Засяленне далін рэк. Апошні ледавік адступіў з тэрыторыі нашай краіны 15—13 тыс. гадоў назад. Паступова клімат рабіўся больш цёплым. Былая ледзяная пустыня пакрылася рэкамі і азёрамі.

Шматлікімі статкамі блукалі па дрымучых лясах зубры, туры, ласі. На зялёных лугах пасвіліся табуны дзікіх коней. У паветры ляталі чароды птушак. Прыродныя багацці Беларусі прываблівалі старажытных людзей.



Каменны век у Беларусі


Чалавек зрабіў чарговую спробу рассяліцца па далінах *Дняпра, Прыпяці, Сожа.* Нарэшце роўныя прасторы ўздоўж рэк, іх *даліны* былі заселены плямёнамі паляўнічых, рыбаловаў і збіральнікаў. Яны будавалі драўлянае жыллё — *буданы конусападобнай формы.*

6—5 тыс. гадоў назад кліматычныя ўмовы на тэрыторыі Беларусі яшчэ больш палепшыліся. Людзі пераходзілі на ***аселы спосаб жыцця.*** Іх паселішчы знаходзіліся на берагах рэк, азёраў ці на прыбярэжных пясчаных невялікіх пагорках — дзюнах.

Стаянкі таго часу нярэдка размяшчаліся групамі блізка адна ад адной. Памеры іх былі невялікія: некалькі паўзямлянак (такім быў новы тып жылля людзей) будавалася на ўзвышаным беразе ракі або возера.

Новыя вынаходніцтвы. У лясах, балотах, рэках і азёрах заўсёды было дастаткова дзічыны і рыбы. Для таго каб здабыць лася або аленя ў лясной чашчобе ці забіць хуткага зайца, асцярожную птушку, патрабаваліся новыя прылады палявання.

Вельмі зручнай прыладай для гэтага стаў ***лук.*** Яго вынайшлі прыкладна 12 тыс. гадоў назад. Стрэлы былі драўляныя. Яны мелі каменны наканечнік. Страляць з лука можна было на 80—100 метраў. Старажытныя людзі смела палявалі з ім на драпежных звяроў,



Каменныя сякеры, якія прымацаваны да драўляных ручак


на ляту білі гусей, качак, чапляў і іншых птушак.

У канцы каменнага веку часцей ужывалася ***каменная сякера.*** Спачатку сякеры былі вельмі прымітыўныя. Людзі бралі кавалак каменю і аббівалі яго, пакуль не атрымлівалася нешта падобнае на клін. Тупым канцом яго ўстаўлялі ў расшчэпленую палку або проста прывязвалі да яе. Пазней аббіты камень пачалі шліфаваць на каменнай пліце, на якую падсыпалі мокры пясок.

Не адной каменнай сякерай абыходзіўся тады чалавек. У яго было ўжо нямала іншых каменных прылад. Людзі ведалі зерняцёрку. ***Зерняцёрка*** — вялікі плоскі камень, на якім жанчыны меншым каменем расціралі цвёрдыя карані і зерне, расколвалі арэхі, драбілі косці жывёл. Клубні і карані спачатку вымочвалі ў вадзе, а затым падпякалі на вогнішчы.




Размол зярнят на зерняцёрцы



Цясла, з дапамогай якой выдзёўбвалі лодкі (чаўны)

З'яўленне глінянага посуду. Выраб гліняных пасудзін на Беларусі пачаўся звыш 6 тыс. гадоў назад. Да гэтага жыхары карысталіся драўляным посудам, які быў абмазаны глінай.

Аб вырабе глінянага посуду сведчаць яго абломкі, знойдзеныя на шматлікіх стаянках канца каменнага веку. Спачатку посуд быў грубы і нетрывалы. Яго выраблялі ў кожным паселішчы. Паверхня пасудзін старанна загладжвалася. Яны пакрываліся ўзорамі ***(арнаментам),***




Арнаментаваны гаршчок з вострым дном

3. Зак. 413.

прасушваліся на паветры, абпальваліся на адкрытым вогнішчы.

Гаршкі таго часу мелі вострае дно. Тады людзі не ведалі яшчэ сталоў. Посуд з вострым дном добра стаяў на земляной падлозе жылля і ў вогнішчы. Ён зручна ўстанаўліваўся ў пяску ў час вандраванняў.

Гліняны посуд значна палепшыў умовы жыцця чалавека. Цяпер ён мог варыць ежу і больш надзейна захоўваць харчовыя запасы. Посуд служыў і для піцця.



Пасля адступлення ледавіка першабытныя плямёны паступова асвойвалі даліны рэк. У людзей з'явіліся новыя вынаходніцтвы: лук і стрэлы, каменная сякера, зерняцёрка. Распаўсюдзіўся гліняны посуд, які стаў для чалавека вельмі неабходным.

? **1.** Чаму пасляледавіковы перыяд называюць «часам лука і стралы»? **2.** Пакажыце на карце важнейшыя напрамкі рассялення людзей у пасляледавіковы перыяд. **3.** Для чаго першапачаткова выкарыстоўвалася

зерняцёрка? **4.** Якое значэнне мела вынаходніцтва глінянага посуду? **5.** Як выглядалі найбольш старажытныя гліняныя пасудзіны? **6.** Растлумачце, што такое *арнамент*.


§ 5. ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

*Успомніце: **1.** Якія спосабы паляванння існавалі ў ледавіковы перыяд? **2.** З дапамогай якіх прылад працы людзі займаліся збіральніцтвам?*

Існаванне першабытных людзей за кошт прыроды. У каменным веку чалавек мог існаваць толькі дзякуючы прыродзе. Нашы далёкія продкі атрымлівалі ад яе ўсё неабходнае. Яны ў пасляледавіковы перыяд займаліся паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам. Людзі, якім тады давялося жыць на беларускіх землях, не ведалі ні земляробства, ні жывёлагадоўлі.



Спосаб лепкі гаршка з гліны




Апрацоўка крэменю

Асаблівасцю каменнага веку было тое, што чалавек браў ад прыроды ўсё ў гатовым выглядзе. Такі від гаспадаркі называецца ***спажывецкім,*** або ***прысвойваючым.*** Ён дапамагаў людзям выжыць і паступова ўзняцца на новую гістарычную ступень свайго развіцця.

Асобныя віды промыслаў. ***Промыслы*** — гэта заняткі, здабыванне сродкаў існавання. Сярод іх, напрыклад, *рыбалоўства, бортніцтва* (здабыванне мёду дзікіх пчол), *лоўля птушак.*

Роля рыбалоўства ўзрасла неўзабаве ў пасляледавіковы перыяд, калі клімат зрабіўся больш цёплым і вільготным. У канцы каменнага веку рыбалоўства стала найбольш надзейнай крыніцай здабывання ежы. Нашы далёкія продкі ведалі розныя спосабы лоўлі рыбы. Яе маглі лавіць проста рукамі. Рыбу і ракаў лавілі ў норах, на мелях, у лужынах пасля спаду паводкавай вады.

Для рыбалоўства выкарыстоўвалі лодкі ***(чаўны).*** Яны выдзёўбваліся з суцэльнага ствала дубу ці хвоі. Вясной, калі рыба ішла ў больш ціхія месцы на нераст (адкладванне ікры), яе білі гарпунамі з лодак. ***Гарпун*** — кідальная зброя для палявання на звяроў і рыб. Востры зубчасты наканечнік рабіўся з каменю ці косці і быў змацаваны з драўляным дзяржаннем.



Рыбалоўныя кручкі, якія зроблены з касцяных пласцінак, знойдзеныя пры раскопках стаянак у Беларусі

Невялікія рэчкі перагароджвалі плятнямі з галінак. У плятні рабілася адтуліна для сеткі, у якую трапляла рыба. У канцы каменнага веку для лоўлі рыбы выкарыстоўвалі вуды. Вучоныя знайшлі на стаянках самыя разнастайныя па форме і памерах рыбалоўныя кручкі. Яны выразаліся з тонкіх касцяных пласцінак.

Са старажытных часоў чалавеку быў вядомы мёд. Чалавек браў яго ў пчаліным гняздзе, якое выпадкова знаходзіў у дупле дрэва. Пры гэтым знішчалася пчаліная сям'я. Пазней чалавек навучыўся ахоўваць і даглядаць дзікіх пчол у выяўленых дуплах. Так узнікла бортніцтва.


З дапамогай самалоўных прыстасаванняў сіла́ (пятлі) і сетак (перавесаў) лавілі птушак. Сеткі плялі з суканых нітак. Ніткі рабілі з лыка — маладой кары ліпы ці лазы, садранай доўгай вузкай паласой.

Першабытныя шахцёры. Непадалёку ад *Ваўкавыска,* там, дзе цяпер знаходзіцца пасёлак Краснасельскі, 4 тыс. гадоў назад бераг ракі быў добра знаёмым месцам для многіх людзей. Іх усіх вяла сюды патрэба ў *крэмені* — незаменным матэрыяле для вырабу прылад працы. У гэтых месцах на невялікай глыбіні знаходзяцца радовішчы крэйды, у якіх сустракаюцца кавалкі якаснага крэменю.

Спачатку мясцовае насельніцтва збірала крэмень на паверхні. У канцы каменнага веку людзі перайшлі да яго здабычы ў крэйдавай тоўшчы. Для гэтага капалі невялікія ямы. Затым ямы паглыбляліся і нагадвалі сабой прымітыўныя *шахты,* падобныя да калодзежаў. Глыбіня шахты складала 3—5 метраў. Здабыты крэмень змяшчалі ў мяшок, які на вяроўцы выцягвалі наверх.

Праца вялася нескладанымі інструментамі — капалкамі, малаткамі-даўбешкамі, кіркамі. З кавалкаў крэменю выраблялі сякеры. Яны распаўсюджваліся на тэрыторыі Панямоння.

У адной шахце знойдзены шкілет чалавека. Побач ляжала касцяная іголка для сшывання скураных мяшкоў. Каля ног стаяла невялікая гліняная пасудзіна. Гэта было пахаванне першабытнага шахцёра, які тут памёр. Па знойдзеным чэрапе вучоныя ўзнавілі выгляд чалавека. Ён не адрозніваўся ад сучасных людзей.



Шахты на беразе ракі Рось у Ваўкавыскім раёне
каля 4000 гадоў назад

У каменным веку здаўна існавала спажывецкая, або прысвойваючая, гаспадарка. Чалавек браў ад прыроды ўсё ў гатовым выглядзе. Людзі займаліся паляваннем, збіральніцтвам, рыбнай лоўляй, бортніцтвам, лоўляй птушак. Асноўныя прылады працы рабілі з крэменю.

? **1.** Які від гаспадаркі называюць спажывецкім (прысвойваючым)? **2.** Растлумачце, чаму ў каменным веку існаваў такі від гаспадаркі, як спажывецкі. **3.** Якія спосабы лоўлі рыбы ведалі нашы далёкія продкі? **4.** Адкуль вучоныя даведаліся, што ў канцы каменнага веку рыбу лавілі вудамі? **5.** Што такое *бортніцтва?* **6.** Дзе знаходзяцца самыя старажытныя шахты на Беларусі? Што ў іх здабывалі? **7.** Растлумачце, што такое *промыслы.*

§ 6. СУПОЛЬНАСЦІ ЛЮДЗЕЙ КАМЕННАГА ВЕКУ. МАЦЯРЫНСКІ РОД

Успомніце: Якія ўмовы жыцця найстаражытнейшых людзей прымушалі іх аб'ядноўвацца?

Родавая абшчына. Чалавек ведаў, што ў адзіночку ён будзе бездапаможны і загіне. У невялікай групе людзей існавала пачуццё згуртаванасці і ўзаемнай дапамогі. Таму найстаражытнейшыя людзі аб'ядноўваліся ў групы (20—30 чалавек), якія былі падобны на статак



Паселішча родавай абшчыны

жывёл. Такую групу людзей гісторыкі называюць ***праабшчына,*** альбо ***першабытны чалавечы статак.***

«Чалавек разумны» жыў ужо родавымі абшчынамі. ***Родавая абшчына*** — гэта калектыў (невялікая група) старажытных людзей. Яна налічвала прыкладна 50—70 чалавек. Людзі, якія ўваходзілі ў родавую абшчыну, былі звязаны адзін з адным сваёй роднасцю, сваяцтвам. Усе яны былі блізкімі родзічамі і вялі агульную гаспадарку. Першапачаткова роднасць у абшчыне лічылася па жаночай лініі. Адсюль назва ***мацярынскі род.*** Свайго бацьку дзеці амаль не ведалі.

Адметнай рысай роду з'яўляецца *раўнапраўнасць* усіх кроўных сваякоў. Найбольш важ-


ныя пытанні іх жыцця вырашаў ***агульны сход*** дарослых членаў роду. Род выбіраў ***старэйшыну*** — самага вопытнага чалавека, які ўплываў на родзічаў. Старэйшына клапаціўся аб інтарэсах роду. Ён карыстаўся агульным даверам, і родавая абшчына выконвала яго загады. Асаблівасцю абшчыны было сумеснае валоданне прыладамі працы. Людзі мелі *агульную маёмасць*.

Спрэчкі з-за парушэнняў правоў на тэрыторыю, якую займаў род, вырашаліся ваеннымі сутычкамі. Сутычкі былі невялікія, звычайна да першых параненых ці забітых. Потым пачыналіся перагаворы аб міры.

Аб'яднанне родаў у плямёны. З павелічэннем колькасці насельніцтва некаторыя члены роду аддзяляліся і пераходзілі жыць на новыя месцы. Так утвараліся новыя роды.

Роды аб'ядноўваліся ў плямёны. Адбывалася гэта на тэрыторыі Беларусі 12—7 тыс. гадоў назад. ***Племя*** — трывалае аб'яднанне некалькіх родаў, якія звязаны агульнасцю паходжання. Яно ўзнікала на аснове кроўных сувязей.

Роды аднаго племені размаўлялі на адной мове, мелі агульнае племянное імя. Найбольш важныя пытанні вырашаў агульны сход племені. Адбываліся нарады родавых старэйшын. Адзін са старэйшын быў кіраўніком племені.



Спосаб выкарыстання крамянёвай прылады працы *(а)*; здабыча агню з дапамогай лучковай цецівы *(б)*

Прыкладна 6 тыс. гадоў назад на тэрыторыі Беларусі адбываўся значны прырост насельніцтва. Яго павелічэнне садзейнічала ўзнікненню новых супольнасцей людзей — *груп плямён*. Устанавіць гэта археолагам дапамагло падабенства прылад працы з каменю, косці, якія былі выяўлены пры раскопках стаянак таго часу. Асаблівае значэнне меў арнамент на гліняных гаршках. У кожнай групы плямён ён асобы. Адрозненні былі і ў формах пасудзін.

СУПОЛЬНАСЦІ ЛЮДЗЕЙ КАМЕННАГА ВЕКУ

ПЕРШАБЫТНЫ СТАТАК → РОДАВАЯ АБШЧЫНА → ПЛЕМЯ — САЮЗ РОДАЎ → ГРУПА ПЛЯМЁН

Суровая барацьба за існаванне прымушала людзей жыць сумесна — цесна з'яднанымі родамі, якія аб'ядноўваліся ў плямёны. У іх усё было агульнае — прылады працы, жыллё, ежа. Такі лад у гісторыі называецца першабытнаабшчынным, ці родаплемянным. Павольна, пераадольваючы вельмі вялікія цяжкасці, ішоў чалавек уперад у сваім развіцці.

? **1.** Чаму першыя насельнікі Беларусі не маглі жыць паасобку? **2.** Як гісторыкі называюць першыя невялікія групы найстаражытнейшых людзей? **3.** Чым родавая абшчына адрозніваецца ад праабшчыны? **4.** Хто распараджаўся маёмасцю ў родавай абшчыне? **5.** Назавіце асноўныя прыкметы племені. **6.** Калі на тэрыторыі Беларусі пачалі ўзнікаць плямёны? **7.** Растлумачце паняцце *першабытнаабшчынны,* ці *родаплемянны, лад.*

§ 7. ЗАРАДЖЭННЕ ВЕРАВАННЯЎ І МАСТАЦТВА Ў ЛЮДЗЕЙ КАМЕННАГА ВЕКУ

Успомніце: У што верылі нашы продкі?


Вераванні першабытнага чалавека. Назіраючы змену дня і ночы, пораў года, маланку і гром, жыццё раслін і жывёл старажытнейшы чалавек не мог зразумець і правільна растлумачыць іх. Гэтыя з'явы прыроды, а таксама

хваробы і смерць замацоўвалі ў свядомасці нашых далёкіх продкаў трывогу і жах. Паступова ў людзей пачалі нараджацца ўяўленні аб звышнатуральных сілах, быццам бы здольных выклікаць такія з'явы. Гэта і было пачаткам ***рэлігійных*** уяўленняў.

Чалавек стаў шанаваць сонца, зямлю, ваду, агонь. Усю прыроду чалавек у сваім уяўленні адушаўляў — насяляў духамі зямлі, сонца, грому, маланкі, расліннасці.

Сон, непрытомнасць, смерць першабытныя людзі тлумачылі выхадам *духа* (душы) з цела. Узнікла вера ў загробнае жыццё. Аб гэтым гавораць пахаванні: разам з нябожчыкам у магілу клалі яго асабістыя рэчы — упрыгажэнні, зброю і запасы ежы. Па ўяўленню першабытных людзей, гэтыя рэчы павінны былі служыць нябожчыку ў яго замагільным жыцці.

Старажытная скульптура. З рэлігійнымі абрадамі звязана мастацтва. Паляўнічыя-збіральнікі ў каменным веку ўжо ўмелі выразаць з каменю, косці, але-



Статуэтка жанчыны, зробленая з ікла маманта (каля 20 000 гадоў назад)



Статуэткі са стаянкі Асавец
(каля 4000 гадоў назад)

невых рагоў фігуркі людзей і жывёл.

Прыкладам старажытнага мастацтва з'яўляецца ***скульптура*** — стварэнне аб'ёмнага вобраза. У канцы каменнага веку ў скульптурах больш увагі аддавалася твару. Пра гэта сведчаць дзве галавы статуэтак, знойдзеных на стаянцы каля вёскі *Асавец* Бешанковіцкага раёна на Віцебшчыне.

Адна статуэтка драўляная. У ёй даволі дакладна адлюстраваны вобраз мужчыны таго часу. Аб суровым яго выглядзе гавораць глыбокія і нізкія вачаніцы і насупленасць твару. Другая выява выразана з рога. Яна дае ўяўленне аб мужчыне з выцягнутым тварам, высокім ілбом і вострай барадой.


Рабіліся статуэткі звяроў і птушак. Паляўнічым было карысна ведаць іх асаблівасці ў час палявання. У той жа вёсцы Асавец знойдзена статуэтка лася. Жывёліна паказана ў напружанай позе, гатовая да скачка.

З'яўленне і ўдасканаленне ўпрыгажэнняў. Ужо на першых вядомых нам стаянках людзей знойдзены падвескі — аздобы для адзення. Старажытныя людзі выраблялі падвескі з пласцінак біўня маманта. Знойдзены ўпрыгажэнні з зубоў ваўка, якія насілі на шыі. Першабытны чалавек надаваў зубам жывёлы чарадзейную сілу. Ён лічыў, што паляўнічы, на шыі якога красуюцца іклы мядзведзя, будзе дужы, як гэты звер. Аздоба з лісіных зубоў павінна была прыбавіць хітрасці яе ўладальніку.


У канцы каменнага веку насельніцтву Беларусі стала даступна новае рэчыва — *бурштын*. Трапляў ён да нашых продкаў шляхам абмену з берагоў Балтыйскага мора. З бурштыну выраблялiся падвескі, гузікі, пацеркі, кольцы на пальцы.

Упрыгажэнні насілі на шыі і запясці, нашывалі на вопратку. Адначасова яны адыгрывалі ролю ***амулетаў.*** Гэта значыць, іх нашэнне, па тагачасных уяўленнях, засцерагала чалавека ад небяспекі, надавала яму моц у барацьбе за існаванне.

Вытокі арнаменту. У канцы каменнага веку дасягае росквіту арнаментаванне гліняных пасудзін. ***Арнамент*** — гэта нанесены на паверхню прадмета ўзор. З'явіліся такія арнаменты, як круг, ромб, крыжападобныя фігуры. Гэтыя знакі былі сімваламі Сонца і іншых нябесных



Арнамент на старажытным гліняным посудзе з Беларусі



Міфалагічныя выявы: *а)* чалавек танцуе перад качкай; *б)* выява чалавека, нанесеная на косці

свяціл, плоднасці, вечнасці прыроды, яе кругавароту.

Надзвычай цікавыя малюнкі змешчаны на некаторых гліняных пасудзінах. На стаянцы каля вёскі *Юравічы* знойдзены кавалак пасудзіны з малюнкам чалавека, які танцуе перад качкай.

Музычныя інструменты. Старажытнейшыя людзі ўдарамі палак адна аб адну адбівалі рытм сваіх першых танцаў. Чалавек выдзёўбваў паглыбленне ў кавалку дрэва і абцягваў скурай. Так узнік ***бубен.*** Ён быў вядомы ў каменным веку ўсім плямёнам. Без яго не абыходзілася ні адна важная падзея.

Нашы продкі ведалі і іншыя музычныя інструменты. На стаянках каменнага веку выяўлены кавалкі трубчастых костак з прасвідраванымі адтулінамі. Гэта рэшткі духавых інструментаў. Яны былі падобныя на сучасныя беларускія ***дудкі,*** ці ***жалейкі.***

Уяўленні старажытных людзей аб звышнатуральных сілах прыроды, узнікшыя ў выніку немагчымасці растлумачыць прыродныя з'явы, прывялі да зараджэння рэлігійных вераванняў. Прыкладамі ўзнікнення першабытнага мастацтва з'яўляюцца ўпрыгажэнні, арнамент, скульптуры, музычныя інструменты.

1. Раскажыце аб тым, што стала пачаткам рэлігійных уяўленняў першабытных людзей. **2.** Што сведчыць аб узнікненні ў людзей веры ў загробнае жыццё? **3.** На якой стаянцы ў Беларусі знайшлі вельмі каштоўныя скульптуры з выявамі галавы чалавека? Да якога часу яны адносяцца? **4.** Якое прызначэнне маглі мець у каменным веку статуэткі звяроў? **5.** Назавіце музычныя інструменты, якія былі вядомы нашым далёкім продкам. З якіх матэрыялаў іх выраблялі? **6.** Растлумачце, што такое *амулет* і для чаго ён прызначаўся.

Абагульненне да раздзела I

I. Пакажыце на карце:

1. Мяжу апошняга ледавіка, які спыніўся на тэрыторыі Беларусі.

2. Месцы выяўлення першых слядоў чалавека на тэрыторыі Беларусі, звязаныя са знаходжаннем археолагамі каменных прылад працы з крэменю.

3. Месцы першых стаянак чалавека каменнага веку на тэрыторыі Беларусі.

4. Буйныя рэкі, уздоўж якіх сяліліся нашы продкі.

5. Асноўныя напрамкі засялення тэрыторыі Беларусі старажытнымі людзьмі.

II. Адзначце на «стужцы часу»:


1. Час узнікнення самых старажытных стаянак чалавека каменнага веку на тэрыторыі Беларусі.

2. Працягласць каменнага веку на тэрыторыі Беларусі з дапамогай азначэнняў «тыс. гадоў да н. э.» і «тыс. гадоў назад».

III. Выпішыце ў адпаведныя слупкі табліцы і растлумачце змест наступных тэрмінаў, паняццяў, назваў: *збіральніцтва, гарпун, дзіда, каменная сякера, род, рыбалоўства, скрабок, паляванне, востраканечнік, старэйшына, племя, «чалавек разумны», ганчарства, ледавік, арнамент, бубен, будан, першабытны статак.*

Матэрыяльная культура (прылады працы, жыллё, гаспадарчая дзейнасць)	
Духоўная культура (вераванні, упрыгажэнні, прадметы мастацтва)	
Развіццё чалавека і супольнасці людзей	

IV. Запоўніце і растлумачце наступны «лагічны ланцужок»:



V. Выканайце наступныя заданні на развіццё гістарычнага мыслення:

1. Паспрабуйце растлумачыць, якім чынам прыродныя з'явы паўплывалі на развіццё першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі.

2. Паразважайце, чаму гаспадарка ў час каменнага веку магла быць толькі спажывецкай (прысвойваючай).

3. Растлумачце, чаму нашы продкі гуртаваліся ў роды, плямёны, супольна працавалі, мелі

агульную маёмасць і былі раўнапраўнымі паміж сабой.

4. Паразважайце над прычынамі ўзнікнення ў нашых продкаў рэлігійных уяўленняў.

VI. Знайдзіце свой населены пункт (раён, вобласць) на карце Беларусі. Адкажыце на наступныя пытанні па гістарычнаму краязнаўству:

1. Прыблізна калі адбывалася засяленне вашай тэрыторыі найстаражытнейшымі людзьмі?

2. Якія сляды існавання найстаражытнейшых людзей выяўлены ў вашай мясцовасці?

3. Уявіце сябе ў ролі наведвальніка сваіх родных мясцін у найстаражытнейшыя часы. Сфармулюйце свае ўражанні на аснове ведання асаблівасцей у жыцці тагачасных і сучасных жыхароў вашага краю. Звярніце ўвагу на прыкметы падзелу працы, мастацкія вырабы, адносіны паміж супляменнікамі. Наведайце агульны сход племені. Паспрабуйце паўдзельнічаць у прыняцці рашэння, задаць пытанні сваім далёкім продкам.

Раздзел II

ЖЫХАРЫ БЕЛАРУСІ Ў БРОНЗАВЫМ І ЖАЛЕЗНЫМ ВЯКАХ





Тэма 3. СТАРАЖЫТНЫЯ ЖЫВЁЛАВОДЫ І ЗЕМЛЯРОБЫ

§ 8. РАССЯЛЕННЕ ІНДАЕЎРАПЕЙСКІХ ПЛЯМЁН

Успомніце: Хто з'яўляўся агульнымі продкамі сучасных беларускага, рускага, украінскага народаў?

Індаеўрапейцы. Прыкладна 4,5 тыс. гадоў назад шматлікія плямёны жывёлаводаў-вандроўнікаў рассяліліся на вялікай тэрыторыі Еўропы і Азіі ад *ніжняй Волгі* да *Рэйна*. Гэта былі індаеўрапейцы. Першапачаткова яны жылі ў Малой Азіі побач з Іранам.

Індаеўрапейскія плямёны таксама праніклі на тэрыторыю Украіны, Беларусі, Прыбалтыкі і Цэнтральнай Еўропы. Пазней індаеўрапейцы змяшаліся з мясцовым насельніцтвам. Адна іх група аформілася ў балтаў, другая — у славян, трэцяя — у германцаў. *Балты* — гэта продкі сучасных літоўцаў і латышоў. *Славяне* — продкі сучасных беларусаў, рускіх, украінцаў, палякаў, чэхаў, балгар, сербаў. *Германцы* — продкі сучасных немцаў, англічан, шведаў і іншых народаў.

Такім чынам, у глыбокай старажытнасці продкі шматлікіх народаў Еўропы жылі бліжэй адзін да аднаго. Іх лёс быў адзіным. Мовы так-




Схема размяшчэння індаеўрапейцаў

сама былі больш падобнымі, чым цяпер. Але паступова народы далёка разышліся. Яны змешваліся з іншымі плямёнамі. У выніку стварылася тая разнастайнасць народаў Еўропы, якую мы назіраем цяпер.

Рассяленне праславян у Еўропе. Прарадзімай славян, месцам іх пачатковага пражывання лічаць шырокі абшар. Ён ахоплівае вярхоўі рэк *Одры* (Одэра), *Вісла*, *Днястра* і часткова *Прыпяці*. *(Знайдзіце на карце гэтыя рэкі.)* Продкі старажытных славян (іх называюць *праславянамі*) паступова распаўсюдзіліся на значныя прасторы Еўропы.



Тэрыторыя рассялення славян каля 2000 гадоў назад

Праславяне займаліся жывёлагадоўляй, якая зрабілася асноўнай і надзейнай крыніцай атрымання мяса, малака, шэрсці. На тэрыторыі Беларусі знаходзяць каменныя свідраваныя баявыя сякеры. Яны сведчаць аб частых сутыкненнях паміж родамі і плямёнамі з-за пашы ў II тысячагоддзі да нашай эры.

Разам з жывёлагадоўляй пашыралася і



Выгляд уязных варот паселішча праславян (Польшча)

земляробства. Ураджай збіралі невялікімі сярпамі. Жанчыны пралі лён і воўну. Іншы раз вучоныя-археолагі пры раскопках праславянскіх помнікаў знаходзяць рэшткі невялікіх круглых свяцілішчаў, звязаных з культам бога ўраджаю.

Праславяне мёртвых хавалі як шляхам спальвання, так і простага пахавання ў магілах. Над магіламі часам насыпалі курганы.

Групы плямён жалезнага веку. На тэрыторыі Беларусі прыкладна 2,5 тыс. гадоў назад у раннім жалезным веку склаліся некалькі новых вялікіх груп плямён. Адна група плямён жыла ў Паўднёвай Беларусі.

У Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі жылі плямёны, адметнай рысай культуры якіх быў гліняны посуд. Яго знешняя паверхня пакрывалася *штрыхамі*. Вучоныя прыйшлі да высновы, што гэтыя плямёны належалі да балтаў. Таму шматлікія назвы рэк і азёраў на тэрыторыі Беларусі захавалі карані, якія ёсць у балцкіх (літоўскай і латышскай) мовах. Адсюль назвы *Волча, Гайна, Друць, Нача, Эса* і інш.

Славяне на тэрыторыі Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі з'явіліся пазней. Яны выцеснілі балтаў або змяшаліся з імі. Новае насельніцтва карысталася старымі назвамі рэк і азёраў. Так вельмі старажытныя назвы дажылі да нашых дзён.

У выніку рассялення індаеўрапейцаў і перамешвання іх з мясцовым насельніцтвам сфарміраваліся праславянскія плямёны — далёкія продкі сучасных беларусаў, рускіх, украінцаў, палякаў, чэхаў, балгар, сербаў і іншых наро-


даў. Славяне, якія з'явіліся на тэрыторыі Беларусі пазней, паступова выцеснілі жыўшыя тут балцкія плямёны або змяшаліся з імі, што пазней паўплывала на паходжанне беларусаў.

? 1. Якія групы плямён аформіліся ў выніку перамешвання індаеўрапейцаў з мясцовым насельніцтвам? 2. Продкамі якіх сучасных народаў былі праславяне? 3. Якая тэрыторыя лічыцца прарадзімай славян? 4. На аснове чаго археолагі зрабілі вывад аб прыналежнасці часткі старажытнага насельніцтва Беларусі да балтаў? 5. Растлумачце паняцці: *індаеўрапейскія плямёны, прарадзіма славян, праславяне.*

§ 9. ПЕРАХОД АД СПАЖЫВЕЦКАЙ ДА ВЫТВОРЧАЙ ГАСПАДАРКІ

Успомніце: 1. Якія віды гаспадарчай дзейнасці людзей існавалі ў каменным веку? 2. Якімі былі заняткі людзей каменнага веку?

Узнікненне жывёлагадоўлі. Старажытны чалавек доўгі час задавальняўся тым, што яму давала прырода. Аднак паляванне і збіральніцтва не маглі пракарміць вялікую колькасць людзей. Старажытныя людзі часта і падоўгу галадалі. У першую чаргу ад голаду паміралі дзеці і старыя. Таму людзі імкнуліся знайсці сабе больш устойлівыя крыніцы здабывання ежы.



Лясны тарпан (конь), прыручаны чалавекам

Людзі пачалі прыручаць жывёл. Першым прыручылі *сабаку*. Спачатку яго мяса выкарыстоўвалі для ежы. Потым свойская жывёла стала надзейным сябрам і памочнікам паляўнічага. Сабака папярэджваў аб небяспецы і высочваў звяроў.

Часам паляўнічыя прыносілі з сабой маладых звяркоў, якіх даглядалі на стаянках. Пазней людзі заўважылі, што жывёлы пачалі размнажацца ў няволі. Народжаныя на стаянках


цяляты і *ягняты* станавіліся зусім свойскімі. Іх можна было пасвіць паблізу паселішчаў і выкарыстоўваць у гаспадарчых патрэбах.

Людзі перайшлі да развядзення жывёл у хатніх умовах. Асабліва хутка асвойваліся ў няволі *свінні*. Лясы Беларусі тады былі багаты дзікамі. Магчыма, свіння была першай пасля сабакі свойскай жывёлай.

ПАЛЯВАННЕ → ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ

З палявання ўзнікала жывёлагадоўля. Першымі пачалі пераходзіць да жывёлагадоўлі жыхары Паўднёвай Беларусі. Яны разводзілі пераважна буйную рагатую жывёлу, свіней і коней. Пераход да жывёлагадоўлі адбываўся за **3 тыс. гадоў да н. э.**

Жывёлагадоўля зрабіла чалавека больш незалежным ад навакольнага асяроддзя. Ён меў гатовыя



Збор ураджаю дзікарослых культур з дапамогай касцянога сярпа з вострымі крамянёвымі ўкладышамі (4000 гадоў назад)

запасы харчавання. Быкоў і коней чалавек стаў выкарыстоўваць як рабочую (цяглавую) сілу.

Першыя земляробы. Земляробства з'явілася на тэрыторыі Беларусі амаль адначасова з жывёлагадоўляй. Яно ўзнікла са збіральніцтва і спачатку стала вядома на Палессі.


ЗБІРАЛЬНІЦТВА → ЗЕМЛЯРОБСТВА

Пра заняткі земляробствам сведчаць адпаведныя прылады. Археолагі выявілі на паселішчах таго часу *матыкі* і *сярпы*.

Нашы продкі рыхтавалі пад пасевы невялікія ўчасткі ў поймах рэк. Апрацоўка зямлі ажыццяўлялася з дапамогай матык. Такое земляробства называецца ***матычным.***



Апрацоўка зямлі з дапамогай матык



Барана-сукаватка *(па даных этнаграфіі)*

Зусім іншым было ***падсечна-агнявое*** земляробства. Падсека, або ляда́, — участак, на якім высякаўся лес. Высахлыя дрэвы спальваліся. У попел сеялі зерне і баранавалі поле кавалкам сукаватага дрэва. Такая прылада называлася *бараной-сукаваткай*. Першыя два-тры гады збіралі добры ўраджай. Праз некалькі




Драўлянае рала, якое знойдзена каля в. Капланавічы Клецкага раёна


гадоў для пасеву патрэбна было рыхтаваць новы ўчастак.

Ураджай збажыны зжыналі крамянёвымі сярпамі. Іх выраблялі з драўляных ці касцяных апраў, у якіх замацоўваліся крамянёвыя ўкладышы.

Праца земляроба стала больш выніковай, калі пры апрацоўцы зямлі для ўзрыхлення (разворвання) глебы пачало выкарыстоўвацца драўлянае *ра́ла*. Узнікла ***ворыўнае*** земляробства.

Рала рабілася з дубовага ствала з сукам, які ўтвараў ральнік (паўзун). Такое рала знойдзена ў тарфяніку паблізу вёскі Капланавічы Клецкага раёна. Драўлянымі раламі рана пачалі карыстацца на поўдні Беларусі, дзе глебы больш урадлівыя. Рала цягнуў бык ці конь.






Вертыкальны ткацкі станок *(рэканструкцыя)*


Пры ворыўным земляробстве павялічвалася колькасць культурных раслін, расла іх ураджайнасць. Вырошчвалі *мяккую пшаніцу, ячмень, проса, гарох, бабы, віку, лён, каноплі.*

Старажытная вытворчая гаспадарка. Паляўнічыя, збіральнікі, рыбаловы пры спажывецкай (прысвойваючай) гаспадарцы карысталіся тым, што было ў прыродзе. Земляробы і жывёлаводы самі вырошчвалі тое, што потым маглі



Крамянёвыя наканечнікі стрэл *(а)*, крамянёвыя сярпы *(б)*

выкарыстаць для ежы: новыя пароды жывёл, новыя гатункі раслін. Жыццё людзей цяпер менш залежала ад прыроды, а ў большай ступені ад іх уласнай працы. Такая гаспадарка называецца ***вытворчай.***



З'яўленне вытворчай гаспадаркі было значным крокам уперад у развіцці грамадства. Пераход ад паляванння і збіральніцтва да жывёлагадоўлі і земляробства забяспечваў тагачаснае насельніцтва прадуктамі харчавання, некаторымі відамі сыравіны для хатніх промыслаў.

? **1.** Калі нашы продкі пачалі займацца жывёлагадоўляй? **2.** Якія дзікія жывёлы на тэрыторыі Беларусі сталі свойскімі? **3.** Назавіце спосабы старажытнага земля-

робства, якія выкарыстоўваліся на тэрыторыі Беларусі. Дайце ім характарыстыку. **4.** Аб чым сведчыць драўлянае рала, знойдзенае на нашай зямлі? Карыстаючыся малюнкам, апішыце яго. **5.** Параўнайце паміж сабой спажывецкі і вытворчы віды гаспадаркі. **6.** Растлумачце паняцці: *матычнае, падсечна-агнявое, ворыўнае земляробства, вытворчая гаспадарка.*


§ 10. РОЛЯ МЕТАЛАЎ У ЖЫЦЦІ СТАРАЖЫТНЫХ ЛЮДЗЕЙ

*Успомніце: **1.** Ці ёсць на тэрыторыі Беларусі радовішчы медзі і волава? **2.** Ці ёсць у вашай мясцовасці або побач населены пункт, назва якога ўтварылася ад слова «руда»?*

Выкарыстанне медзі і бронзы. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі пачаўся каля **2 тыс. гадоў да н. э.** Гэта адбылося значна пазней, чым у краінах, дзе былі радовішчы медзі і волава, сплаў якіх утварае бронзу. Медзь і волава траплялі да нашых продкаў з поўдня (з Прыкарпацця, Каўказа). Адсутнасць уласнай сыравіны стрымлівала шырокае ўкараненне металічных вырабаў на тэрыторыі Беларусі.

Паступова на землях нашых продкаў узнікла бронзаліцейная справа. Бронза лёгка плавіцца пры тэмпературы, якая дасягаецца ў звычайным вогнішчы.

Выкарыстанне медных і бронзавых прылад павысіла вынікovасць працы людзей. Паспя-




Станок для свідравання адтулін у камені

хова замяняліся крамянёвыя прылады працы. З'явіліся медныя і бронзавыя нажы, наканечнікі дзідаў, шылы, сякеры, сярпы.

Аднак у бронзавым веку працягвалі ўжывацца і каменныя прылады. Яны нават дасягнулі сваёй дасканаласці. Пры іх вырабе яшчэ больш, чым раней, выкарыстоўваліся шліфоўка і свідраванне.

Яшчэ ў ледавіковую эпоху чалавек пракручваў адтуліны ў некаторых прыладах працы і ўпрыгажэннях. Затым было адкрыта свідраванне з дапамогай трубчастай косткі, у якую насыпаўся пясок. Поспех свідравання павялічыўся пасля таго, як трубчастая костка прыводзілася ў рух лучковай цецівой (прыстаса-



Каменныя свідраваныя баявыя сякеры, якімі карысталіся нашы продкі 4000—3000 гадоў назад

ванне накшталт лука). Яго цеціва абкручвалася вакол косткі (стрыжня), што надавала ёй вярчальны рух. Прыстасаванне ўжывалася найбольш шырока ў бронзавым веку пры свідраванні адтулін у камені. У гэты час з'явіліся свідраваныя баявыя сякеры, якія добра трымаліся на доўгай драўлянай ручцы.


Здабыча жалеза. Каля **700 г. да н. э.** на тэрыторыі Беларусі пачаўся жалезны век. Адкрыццё жалеза азначала пачатак велізарнага тэхнічнага пераваротy.

Жалезныя руды вельмі распаўсюджаны ў прыродзе. Узяць хоць бы Беларусь. У кожнай вобласці існуюць вёскі, у назве якіх ужываецца слова «руда», — Рудня, Рудзенка, Рудакова. Руду можна знайсці на беразе ракі або возера, на балоце, пад дзірваном лугу. Яе дагэтуль так і называюць *балотнай*, ці *дзірвановай*, рудой.

У балоце або возеры злучэнні жалеза асядаюць бурай каламуццю на дно, утвараючы руду. Па бураму колеру травы людзі знаходзілі балотную руду.

Чаму ж так здарылася, што жалезная руда ёсць усюды, а людзі спачатку пачалі выкарыстоўваць больш рэдкія і менш трывалыя металы — медзь і бронзу? Усё тлумачыцца даволі проста. Жалеза плавіцца пры вельмі высокай тэмпературы. Яна ў два разы вышэйшая за адпаведную тэмпературу плаўлення медзі. Атрымаць такую тэмпературу тагачасныя майстры не ўмелі.


Яны знайшлі спосаб атрымліваць жалеза і пры параўнаўча невысокай тэмпературы. Сабраную жалезную руду «варылі» (награвалі) у *печах-домніцах*. Захаваліся рэшткі старажытнай домніцы каля вёскі Лабеншчына непада-



Домніца для атрымання крычнага жалеза

лёку ад Заслаўя. Печ, зробленая з гліны, была невялікай, у дыяметры менш за метр. У ёй кавалкі руды спякаліся, утвараючы порыстую масу — *крыцу*.

Калі печ астывала, крыцу даставалі. Потым у кузні яе зноў награвалі і плюшчылі цяжкімі молатамі. Так атрымлівалі даволі якаснае крычнае жалеза.



Рэчы з раскопак грунтавога могільніка рубяжа нашай эры каля в. Чаплін Лоеўскага раёна: *а)* жалезныя наканечнікі дзідаў, *б)* спражка, *в)* рыбалоўны кручок, *г)* жалезны серп, *д)* драўлянае верацяно з гліняным прасліцам, *е)* жалезны нож з меднай ручкай

Вынікі адкрыцця жалеза. Працаваць жалезнымі прыладамі было значна лягчэй, чым каменнымі і бронзавымі. Імі можна было больш якасна і хутка апрацоўваць дрэва, косць, шкуру.

З дапамогай жалезнай сякеры ачышчаліся ад лесу значныя дзялянкі для падсечна-агнявога земляробства.

Пры дапамозе жалезных сякер узводзілі больш трывалыя, чым раней, жылыя і гаспадарчыя пабудовы.

Жалеза было асноўным матэрыялам для вырабу зброі — наканечнікаў стрэл і дзідаў, баявых сякер, нажоў ды шмат чаго іншага.

З'явіўся новы спосаб здабывання агню. Ударамі металічнага крэсіва аб крэмень высякаліся іскры.

У раннім жалезным веку многія каменныя і бронзавыя прылады былі заменены жалезнымі. Жалезныя прылады працы, асабліва сякеры, былі неабходнай перадумовай для канчатковага пераходу да земляробства.


? **1.** Што стрымлівала ўкараненне медных і бронзавых вырабаў на Беларусі ў старажытныя часы? **2.** Чаму людзі пачалі спачатку выкарыстоўваць для вырабу прылад працы медзь і бронзу, а не жалеза, якое сустракаецца паўсюдна? **3.** Апішыце спосаб атрымання жалеза старажытнымі жыхарамі беларускіх зямель.

4. Калі пачаўся на тэрыторыі Беларусі жалезны век?
5. Растлумачце, што такое *балотная руда, крыца, печ-домніца.*


§ 11. УТВАРЭННЕ БАЦЬКОЎСКАГА РОДУ

*Успомніце: **1.** У чым заключаўся прыродны падзел працы паміж мужчынамі і жанчынамі ў каменным веку? **2.** Адкуль паходзіць назва «мацярынскі род»?*

Узрастанне ролі мужчынскай працы ў бронзавым веку. На працягу многіх тысячагоддзяў каменнага веку мужчыны і жанчыны



Жалезная сякера і жалезныя сярпы ранняга жалезнага веку з тэрыторыі Беларусі



Высяканне дрэў на ўчастку
для падсечна-агнявога земляробства

займалі амаль роўнае становішча ў здабыванні ежы. Пераход да жывёлагадоўлі і земляробства выклікаў важныя змяненні ў жыцці людзей.

У бронзавым веку мужчынскай справай сталі жывёлагадоўля і падсечна-агнявое земляробства, прыручэнне і догляд жывёл, паляванне і рыбалоўства. Працай мужчын ствараліся пастаянныя харчовыя запасы. Мужчынам таксама неабходна было ахоўваць абшчыну ад набегаў іншых плямён.

Праца жанчыны заўсёды была неабходнай і вельмі карыснай для свайго роду. Яе абавязкам было абагараванне жылля і гатаванне ежы. Не менш часу жанчына траціла на выраб адзення і абутку. Яна займалася збіральніцтвам дароў прыроды, зборам ураджаю і шмат іншым.




Гліняныя гаршкі бронзавага веку

Значную ўвагу аддавала жанчына догляду дзяцей.

Аднак клопаты жанчыны былі абмежаваны хатняй гаспадаркай. Мужчынская ж праца ў параўнанні з жаночай вырашала далейшы лёс усіх суродзічаў. Цяпер мужчына, уступаючы ў шлюб, не пераходзіў у род жонкі, як было раней. Ён забіраў жонку да сябе. Мужчына быў зацікаўлены ў тым, каб перадаць маёмасць сваім дзецям, асабліва сынам. Роднасць пачала лічыцца па мужчынскай лініі. Вялікія сем'і, у якіх мужчына адыгрываў вядучую ролю, называюць ***бацькоўскім родам,*** або ***вялікай патрыярхальнай сям'ёй.***

З'яўленне няроўнасці ў грамадстве. Людзі вынаходзілі металічныя прылады працы, апра-



Каменная арнаментаваная булава (жазло) бронзавага веку — прыкмета ўлады яе валадара

цоўвалі зямлю, разводзілі жывёлу. Кожны жадаў лепш забяспечыць свае патрэбы. І ніхто не ведаў, да якіх новых важных змен у жыцці грамадства гэта прывядзе.

Ствараліся ўмовы для накаплення багацця ў руках асобных людзей і сем'яў. Багацці пачалі нераўнамерна размяркоўвацца сярод іх.


Напрыклад, у адных сем'яў было больш жывёлы, запасаў зерня, футра, чым у другіх. У абшчыне земляробаў і жывёлаводаў з'явіліся першыя прыкметы расслаення на больш заможных і бедных абшчыннікаў.

Аб з'яўленні маёмаснай няроўнасці сведчаць пахавальныя помнікі таго часу. Пры раскопках у бедных пахаваннях знаходзяць адзін гаршчок ці адну прыладу працы. У іншых па-

хаваннях рэчаў зусім няма. Некаторыя ж магілы налічваюць дзесяткі знаходак: медныя, бронзавыя і бурштынавыя вырабы.

Паміж абшчынамі, родамі, плямёнамі адбываліся сутычкі. Людзі імкнуліся захапіць як мага больш здабычы. Нечакана ўзнікалі войны. Захопленыя палонныя выкарыстоўваліся для працы ў сем'ях старэйшын і ваенных кіраўнікоў. Так узнікла патрыярхальнае (хатняе) рабства.

Будаўніцтва гарадзішчаў. У раннім жалезным веку, каб абараніць сябе і сваю маёмасць, пачалося будаўніцтва ўмацаваных паселішчаў,



Умацаванае паселішча (гарадзішча) патрыярхальнага роду каля в. Малышкі Вілейскага раёна *(рэканструкцыя)*



Старажытныя людзі будуюць умацаванне на гарадзішчы

так званых ***гарадзішчаў.*** Тут жылі сем'і былой родавай абшчыны.

Гарадзішчы будаваліся на ўзвышшах і ўмацоўваліся земляными валамі, равамі, драўлянымі сценамі. Гэта рабілася з прычыны магчымага нападу суседзяў, якія маглі захапіць статкі жывёлы і іншую маёмасць роду.

На Беларусі ў кожнай вобласці захаваліся гарадзішчы. Найбольшая колькасць старажытных гарадзішчаў ранняга жалезнага веку выяўлена ў Віцебскай, Гомельскай, Мінскай абласцях.

З развіццём жывёлагадоўлі і земляробства надзвычай узрасла роля мужчыны ў гаспадар-

чым жыцці абшчыны. Утварыліся вялікія бацькоўскія (патрыярхальныя) роды. З'яўляліся прыкметы маёмаснай няроўнасці. Паміж асобнымі абшчынамі, родамі і плямёнамі адбываліся сутычкі і войны. Для абароны ў час нападзення будаваліся гарадзішчы.

? **1.** Чаму ў бронзавым і раннім жалезным вяках у грамадстве ўзрастала роля мужчынскай працы? **2.** Пра якую з'яву ў грамадскім жыцці сведчыць распаўсюджванне гарадзішчаў на Беларусі ў жалезным веку? **3.** Апішыце па малюнку знешні выгляд гарадзішча. **4.** Даведайцеся, ці ёсць у вашым раёне старажытныя гарадзішчы. У якіх месцах яны знаходзяцца? Як іх называе мясцовае насельніцтва? **5.** Растлумачце паняцці: *бацькоўскі род, гарадзішча.*

Тэма 4. КУЛЬТУРА НАШЫХ ПРОДКАЎ


§ 12. НАРОДНЫЯ ВЕРАВАННІ І СВЯТЫ

Успомніце: Чаму старажытныя людзі пакланяліся з'явам прыроды?

Пакланенне з'явам прыроды ў Беларусі. Старажытнаму чалавеку свет у цэлым уяўляўся адушаўлёным. Наш продак верыў, напрыклад, што дрэвы маюць душу, валодаюць пачуццямі і могуць дапамагчы ў цяжкую хвіліну. Па гэтай прычыне ён пакланяўся дрэвам. Асабліва

Знак Сонца, агню
і дамашняга ачага —
характэрны арнамент
для індаеўрапейцаў
на бронзавым упрыгажэнні
III—IV стст. з Лукомля
Чашніцкага раёна





Гліняныя прасліцы для верацён з арнаментам,
у якім адлюстравана Сонца (ад цэнтра адыходзяць прамяні)



Вужовы кароль у сялянскай хаце

шанаваўся дуб. Яму прыносілі ў ахвяру жывёл і птушак. Лічылася, што такім чынам можна заахвоціць, угаварыць дрэва дапамагчы людзям у будучых справах.

Існаваў звычай пакланення вужам. ***Звычай*** — гэта правілы паводзін, якіх прытрымліваюцца людзі. У вужах бачылі добрых пасланцоў. Таму да іх звярталіся з малітвамі (просьбамі) аб

хуткім дажджы, добрым ураджаі, а часам аб простым чалавечым шчасці.


У беларусаў існуе шмат легенд пра ваўкоў. Яшчэ старажытнагрэчаскі гісторык *Геродот* запэўніваў, што людзі з плямён неўраў, якія жылі паблізу ракі Прыпяці, былі чараўнікамі. Кожны з іх ператвараўся хоць адзін раз у год на некалькі дзён у ваўка. Такі пярэварацень меў сваю назву — «ваўкалак».

На тэрыторыі Беларусі быў вельмі шырока распаўсюджаны культ пакланення камяням. Людзі называлі іх «Кравец», «Змееў камень», «Чортаў ступень». Лічылася, што ўсе яны маюць магічную сілу, лечаць хворых.

Народныя абрады і святкаванні земляробаў. Магутныя нязведаныя сілы прыроды здаўна выклікалі ў чалавека не толькі страх, але і імкненне падпарадкаваць іх, прымусіць служыць сабе.

Каб забяспечыць высокі ўраджай, дабрабыт сям'і, захаваць жывёлу, выконваліся розныя тайныя абрады. ***Абрад*** — гэта пэўныя дзеянні, у якіх праяўляюцца вераванні людзей. Разгледзім некаторыя народныя абрады і святкаванні.

Каляды — пачатак святкавання ў гонар зімовага сонцастаяння. Сонцастаянне — гэта той момант, калі дзень пачынае памяншацца ці, наадварот, павялічвацца. Паводле народнага



Абрад здабывання «жывога» агню, які паводле народных вераванняў мае ўласцівасць ахоўваць чалавека ад шматлікіх бедстваў

выразу, «ад Каляд Сонца паварочваецца на лета», гэта пачатак новага жыцця, аднаўлення прыроды. *(Успомніце, чаму адбываецца змена вышыні Сонца, якая з 22 снежня да 22 чэрвеня ўзрастае, а затым змяншаецца.)*

На Каляды праводзілі ігрышчы. Танцавалі, гулялі, слухалі казкі, адгадвалі загадкі, спявалі песні. Вечарам моладзь хадзіла па вёсцы з віншаваннем. Усе сабраныя пачастункі дзялілі калядніка пароўну.

Масленіца — старажытнае свята, прысвечанае провадам зімы і сустрэчы вясны. На свята пяклі бліны, аладкі. Вадзілі карагод, спявалі веснавыя песні.

Купалле — найбольш папулярнае летняе свята. Яго гісторыя пачынаецца з каменнага веку. Паходжанне купальскіх святкаванняў звязана з шанаваннем Сонца і раслін.

Распальвалася агнішча. Каля яго частаваліся абрадавай стравай. Моладзь пераскоквала цераз агонь. Ён лічыўся ачышчальным ад злых духаў. Купалле — свята моладзі і кахання.



Старажытнае народнае свята

Народныя вераванні і святы звязаны з пакланеннем з'явам прыроды, клопатам аб зямлі і ўраджаі. Яны з'яўляюцца сапраўдным багаццем культуры беларускага народа.

? **1.** Якім з'явам прыроды пакланяўся старажытны чалавек (назавіце 3—4 прыклады). **2.** Пералічыце народныя святы старажытных земляробаў, якія вам вядомы, і растлумачце іх назвы. **3.** Як вы разумееце народны выраз «ад Каляд Сонца паварочваецца на лета»? Што такое сонцастаянне? **4.** Як нашы продкі святкавалі Купалле? **5.** Падрыхтуйце паведамленне аб адным з народных святкаванняў.

§ 13. БЫТАВЫЯ ЗВЫЧАІ І АБРАДЫ

Успомніце: Што такое абрады?

Шлюбна-сямейныя абрады. У родавай абшчыне маладому чалавеку можна было жаніцца толькі з дзяўчынай з другога роду. Мужчыны аднаго роду бралі нявест з другога роду, а сваіх маладых сваячак туды аддавалі замуж.

З распадам родавых абшчын паступова ўсталёўвалася аднашлюбная сям'я. Яна больш трывала аб'ядноўвала мужа і жонку. Аднак становішча жонкі ў сям'і пагоршылася. У мужчыны заўсёды была перавага, напрыклад, мужчына меў больш маёмасці, чым жанчына.

Уступленне ў шлюб лічылася надзвычай

важнай падзеяй у жыцці маладых людзей. У тыя часы зарадзіліся такія віды шлюбу, як «*умыканне*» (выкраданне) і «*купля-продаж*» нявесты. Малады мужчына адпраўляўся здабываць сабе жонку з другога роду. Пазней гэты звычай быў заменены *шлюбам па дамоўленасці*. Пасланцы маладога (сваты) дамаўляліся з бацькам маладой аб шлюбе і памеры выкупу. Праз некаторы час адбывалася вяселле.

Маладую ўсаджвалі на звярыную шкуру. Гасцям раздавалі вясельны «калач» (каравай). *Каравай* — вельмі старажытны звычай, вядомы яшчэ індаеўрапейцам. Маладая развязвала мужу абутак. Гэта было прыкметай таго, што яна дае згоду поўнасцю падпарадкоўвацца свайму суджанаму. Вяселле з вельмі даўніх часоў суправаджалася карагодам, песнямі і рознымі маскарадамі.

Выхаванне дзяцей. У першабытныя часы дзецям прывіваліся такія рысы, у якіх было зацікаўлена грамадства. Сэнс выхавання зводзіўся да наступных норм: павага да старэйшых і безагаворачнае падпарадкаванне ім, павага да жанчыны, гатоўнасць да ахвяры ў інтарэсах роду і племені, мужнасць і сціпласць, любоў да сваіх дзяцей.

Парушальнікаў існуючых правіл грамадства жорстка карала, у некаторых выпадках нават смерцю.


Выхаваўчае значэнне мелі нават гульні. Асабліва стральба з лука, чым займаліся і хлопчыкі і дзяўчынкі. Калі яны дасягалі поспехаў, прымянялі свае навыкі ў практычным жыцці.



Дзеці вучацца страляць з лука

Пахавальныя абрады. Звычай пахавання звязаны з узнікненнем вераванняў старажытных людзей аб тым, што душа памёршага працягвае сваё існаванне і пасля смерці чалавека. З аднаго боку, памёршага баяліся, ён выклікаў страх, з другога — яго імкнуліся задобрыць, улагодзіць, упрасіць не пакідаць родзічаў.

Найбольш распаўсюджанымі былі два абра-



Рэчы з багатага курганнага пахавання бронзавага веку каля в. Ходасавічы Рагачоўскага раёна: крамянёвыя наканечнікі стрэл, бронзавая сякера і наканечнік дзіды

ды. Па першаму абраду цела памёршага змяшчалася ў яму, ці, як кажуць, закопвалася ў зямлю. Яго клалі галавой на захад, тварам да ўзыходзячага сонца. Паводле другога абраду памёршага спальвалі на агні. Агонь лічылі свяшчэннай сілай. Яму і аддавалі нябожчыка.

Старажытныя людзі верылі, быццам бы памёршаму «на тым свеце» неабходна ўсё, чым ён карыстаўся пры жыцці. Таму нябожчыку клалі яго рэчы, якія нібыта патрэбныя ў «замагільным жыцці». Гэта былі ўпрыгажэнні, зброя, прылады працы і хатняга ўжытку.

На тэрыторыі Беларусі існаваў звычай насыпаць над магіламі курганы. ***Курган*** — гэта насып з пяску ці з іншага грунту. Сярэдняя вышыня кургана складала 1—2 метры.

З усталяваннем аднашлюбнай сям'і зарадзіліся пэўныя шлюбна-сямейныя адносіны. Клопат аб дзецях і іх выхаванне сталі абавязковымі нормамі (правіламі) у чалавечым грамадстве. З'яўленне веры людзей у бессмяротнасць душы паўплывала на пахавальныя абрады.

? **1.** Якія звычаі існавалі ў старажытнасці ў час вяселля? **2.** Растлумачце, што такое *ўмыканне*. **3.** Што такое *купля-продаж* нявесты? **4.** Якія рысы прывіваліся дзецям у старажытным грамадстве? **5.** Якімі былі пахавальныя абрады?


§ 14. РАЗВІЦЦЁ СТАРАЖЫТНАГА МАСТАЦТВА

Успомніце: Што такое «статуэтка», «арнамент»?


Вырабы старажытных майстроў. У старажытныя часы асаблівае значэнне мела арнаментаванне гліняных пасудзін. З распаўсюджаннем жывёлагадоўлі і земляробства звязана з'яўленне такіх арнаментаў, як круг, ромб, крыжападобныя фігуры. Гэтыя знакі былі сімваламі Сонца, Зямлі, урадлівасці, вечнасці прыроды, яе кругавароту.

У жалезным веку рабілі фігуры жывёл з гліны. Гліняныя статуэткі коней археолагі знайшлі на гарадзішчах у Гомельскай вобласці. Яны сведчаць аб шанаванні прыручанага каня.

Тады жанчыны любілі аздабляць сябе, вопратку. У гэты час рабіліся бранзалеты ў вы-




Гліняная статуэтка каня, якая зроблена 2000 гадоў назад і знойдзена на Гарошкаўскім гарадзішчы Рэчыцкага раёна




Бронзавыя бранзалеты, якія ўжывалі праславянскія плямёны 3000 гадоў назад, выпадкова знойдзеныя каля в. Здзітава Бярозаўскага раёна на Брэстчыне

глядзе вялікага кольца, якое насілася вышэй кісці рукі. Былі распаўсюджаны металічныя ўпрыгажэнні — шпількі *(фібулы)* для зашпільвання верхняга адзення тыпу плашчоў-накідак. Выраблялiся шпількі з кавалкаў дроту. Іх знешняя паверхня часта аздаблялася ўзорам.

Прыгожа выглядалі бронзавыя жаночыя падвескі, якія выраблялі старажытныя майстры. Іх насілі, як каралі. Называюць падвескі *лунніцамі*, таму што яны нагадваюць сярпок Месяца (Луны). У сярэдзіне кожнага вырабу былі невялікія паглыбленні. Яны запаўняліся шклопадобнай масай чырвонага колеру, якая называ-



Шпілька (фібула) з в. Чаплін Лоеўскага раёна (каля 2000 гадоў назад)



Бронзавая падвеска-лунніца з чырвонай эмаллю са старажытнага паселішча каля в. Адаменка Быхаўскага раёна

ецца эмаллю. Многія ўпрыгажэнні адыгрывалі ролю амулетаў, якія быццам засцерагалі яго ўладальніка ад небяспекі.

Міфы нашых продкаў. Асобным відам творчасці з'яўляюцца старажытныя ***міфы*** — вусныя апавяданні з фантастычнымі (неверагоднымі) дзівоснымі вобразамі. Узорамі твораў пра далёкае мінулае беларускага народа, яго паходжанне з'яўляюцца міфалагічныя апавяданні пра волатаў і *курганы-валатоўкі*, у якіх нібыта пахаваны людзі незвычайна вялікія і дужыя.



Бронзавая дыядэма
з бурштынавымі падвескамі
з пахавання
(3500 гадоў назад)

На Беларусі былі шырока распаўсюджаны міфы пра дрэвы (дуб, бяроза), пра кветкі (папараць-кветка), пра паходжанне асобных рэк, азёраў, балот. Беларусы, як і іншыя народы, у міфах імкнуліся растлумачыць навакольны свет. Існавалі шматлікія паданні пра *русалак* — маладых прыгожых жанчын з доўгімі, да пят, косамі, якія жывуць у лясах, балотах, пра *лесавікоў*, што валадараць над лясамі, і *дамавікоў* — гаспадароў у хаце.

Нашым продкам добра вядома імя Белуна. Народная прымаўка «Пасябрыўся з Белуном» азначае — «разбагацеў». Існуе цікавая легенда пра тое, як Бялун стварыў Сусвет.

Аднойчы ён убачыў шар, які плыў міма яго. Адтуль чулася жалобнае мяўканне. Заўсёды добразычлівы, Бялун вызваліў з шара вязня. Ім аказаўся чорт. Бялун расказаў яму пра сваё імкненне стварыць Сусвет і загадаў спусціцца на дно мора, каб узяць там жменю зямлі. Той падпарадкаваўся. Але, пакуль чорт спускаўся,

яму ў галаву прыйшла думка, што ён сам мог бы стварыць Сусвет. Таму чорт узяў у прыгаршчы зямлі з дна мора, а яшчэ крыху схаваў у роце, каб выканаць сваю задуму. Вярнуўшыся, ён аддаў зямлю Белуну. Той пракрычаў: «Зямля, расці!» Жменька зямлі пачала расці і расці і ператварылася ў сушу. Але ў гэты час зямля, схаваная чортам у роце, таксама пачала расці. Шчокі яго раздзьмуліся, і зямля пачала выпіраць з рота. Спалоханы чорт кінуўся наўцёкі, пакідаючы за сабой дарожку зямлі, якая сфарміравала горы і пагоркі.

Беларускія сяляне на Палессі расказваюць, што, калі чорт дасягнуў іх мясцовасці, запасы зямлі ў яго роце закончыліся, і таму іх зямля засталася нізіннай і тут утварыліся балоты.

Паводле паданняў, Бялун любіць прыходзіць на палеткі падчас жніва. Верагодна, ён упершыню «завітаў да нашых далёкіх продкаў, калі яны пакінулі пастухоўскі лад жыцця і пачалі займацца земляробствам. Магчыма, гэта здарылася ў той час, калі нашы продкі ўваходзілі ў індаеўрапейскую сям'ю. Назва «белы» паходзіць ад старажытнаіндыйскага слова, якое мае значэнне «бляск, зіхаценне».

Старажытныя статуэткі і фігуркі, арнамент на гліняным посудзе, жаночыя ўпрыгажэнні з'яўляюцца прыкладамі развіцця мас-

тацтва. Беларуская міфалогія стала каштоўнай крыніцай для вывучэння вераванняў і звычаяў нашых продкаў.

1. Апішыце, якімі былі старажытныя ўпрыгажэнні. **2.** Як выглядалі бронзавыя бранзалеты? **3.** Чым зашпільвалі верхняе аддзенне тыпу плашчоў-накідак? **4.** Што азначаюць назвы *лунніца, курганы-валатоўкі?* **5.** Што такое *міфы?* **6.** Чаму прысвечаны міфы, якія былі шырока распаўсюджаны ў Беларусі? **7.** Як у легендзе пра Белуна тлумачыцца паходжанне балот вакол Прыпяці? **8.** Раскажыце вядомыя вам легенды і міфы пра старажытных людзей і з'явы прыроды.

Абагульненне да раздзела II

I. Пакажыце на карце:

1. Асноўныя напрамкі засялення тэрыторыі Беларусі індаеўрапейскімі плямёнамі.

2. Тэрыторыю, дзе знаходзілася прарадзіма славян.

3. Тэрыторыю рассялення славян на рубяжы нашай эры. Паміж якімі буйнымі рэкамі знаходзілася гэтая тэрыторыя?

4. Вызначце, якія плямёны знаходзіліся ў непасрэднай блізкасці да славян (гл. схему на с. 56).

5. З якой часткі тэрыторыі сучаснай Беларусі пачалося распаўсюджанне жывёлагадоўлі і земляробства.

II. Адзначце на «стужцы часу»:

1. Працягласць бронзавага і жалезнага вякоў на тэрыторыі Беларусі.

2. Час, калі на тэрыторыі Беларусі пачаўся пераход да жывёлагадоўлі і земляробства.


III. Выпішыце ў адпаведныя слупкі табліцы і растлумачце змест наступных тэрмінаў, паняццяў, назваў: *Купалле, прарадзіма славян, пахавальны абрад, індаеўрапейскія плямёны, вытворчая гаспадарка, гарадзішча,*

курган, падзел працы, рáла, лунніца, скульптура, сям'я, домніца, ворыўнае земляробства, маёмасная няроўнасць, бацькоўскі род.


Матэрыяльная культура (прылады працы, жыллё, гаспадарчая дзейнасць)	
Духоўная культура (вераванні, звычаі, абрады, упрыгажэнні, прадметы мастацтва, легенды і міфы)	
Развіццё чалавека і супольнасці людзей	

IV. Запоўніце і растлумачце наступныя «лагічныя ланцужкі»:

1. Заняткі насельніцтва Беларусі:



2. Развіццё тыпаў земляробства і прылад працы старажытных земляробаў:



V. Выканайце наступныя заданні на развіццё гістарычнага мыслення:

1. Паразважайце, якія прычыны абумовілі пераход да вытворчай гаспадаркі.

2. Паразважайце, да якіх важных новых змен у жыцці першабытнага грамадства прывяло вынаходніцтва металічных прылад працы.

3. Паспрабуйце растлумачыць, якія прычыны абумовілі ўзрастанне мужчынскай працы ў бронзавым веку.

4. Растлумачце, чаму пасля ўзнікнення земляробства стала хутка расці старажытнае насельніцтва.

5. Складзіце апавяданне ад імя старажытнага хлопчыка або дзяўчынкі аб адным дні жыцця ва ўмовах першабытнага ладу. Раскажыце аб занятках і прыладах працы, сваіх супляменніках, адносінах паміж імі, іх вераваннях.

VI. Знайдзіце свой населены пункт (раён, вобласць) на карце Беларусі. Адкажыце на наступныя пытанні па гістарычнаму краязнаўству:

1. Даведайцеся, з якімі мясцінамі ў вашым краі звязаны цікавыя легенды і паданні. Якія яны даюць звесткі аб уяўленнях нашых продкаў пра навакольнае асяроддзе?

2. Апішыце адзін са старадаўніх звычаяў (абрадаў), якія захаваліся ў вашай мясцовасці. Паспрабуйце растлумачыць яго сэнс.

3. Якія месцы вашага краю звязаны са знаходжаннем руды і вырабам металічных прылад працы?

4. Ці ёсць у вашай мясцовасці гарадзішчы? У якім стане яны захаваліся да нашых дзён?

Заключэнне

Юныя сябры! Вы закончылі вывучэнне падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў каменным, бронзавым і жалезным вяках. Гэта многія тысячагоддзі існавання і дзейнасці нашых продкаў. Першабытнае грамадства заклала аснову, на якой развівалася ўся далейшая культура чалавецтва.

Веды, набытыя вамі, дазваляюць зразумець, як развіваецца чалавечае грамадства.

Старажытная гісторыя — першая агульная ступень у гісторыі ўсіх народаў свету. Гэты перыяд быў самым працяглым у гісторыі чалавецтва. Старажытная гісторыя Беларусі — неад'емная частка сусветнай гісторыі.

Далёкае мінулае пакінула нам у спадчыну разнастайныя археалагічныя і гістарычныя помнікі. Найбольш вядомыя і прыметныя з іх у Беларусі — гарадзішчы, умацаваныя равамі і валамі, і пахавальныя курганы.

Зберагаць гістарычныя помнікі — значыць выхоўваць у сабе павагу і любоў да сваёй Бацькаўшчыны. Няхай цікавасць да гісторыі захаваецца ў вас назаўсёды!

Тлумачальны слоўнік гістарычных паняццяў

Абра́д (§ 12) — пэўныя дзеянні, якія чалавек ажыццяўляе згодна са сваімі вераваннямі.

Абшчы́на (§ 6) — калектыў (невялікая група) старажытных людзей, якія вялі агульную гаспадарку і сумесна валодалі прыладамі працы.

Амуле́т (§ 7) — прадмет (невялікая рэч), які людзі насілі на целе. Па іх уяўленнях ён засцерагаў старажытнага чалавека ад небяспекі, спрыяў поспеху ў яго гаспадарчай дзейнасці.

Археало́гія *(Уводзіны)* — навука, якая вывучае жыццё старажытных людзей па знаходках слядоў іх дзейнасці.

Бацько́ўскі род (§ 11) — абшчына, у якой роднасць усіх яе членаў лічылася па мужчынскай лініі.

Бо́ртніцтва (§ 5) — здабыванне мёду дзікіх пчол.

Буда́н (§ 2, 4) — жыллё старажытных людзей конусападобнай формы, якое пакрывалася шкурамі жывёл. Было падобна на шалаш.

Во́рыўнае земляро́бства (§ 9) — земляробства, пры якім для апрацоўкі зямлі выкарыстоўваецца рала.

Вытво́рчая гаспада́рка (§ 9) — гаспадарка, пры якой людзі самі рабілі тое, што неабходна для жыцця: выводзілі новыя пароды жывёл, вырошчвалі новыя гатункі раслін.

Гарадзі́шча (§ 11) — умацаванае паселішча, якое ў Беларусі ўзнікае ў канцы бронзавага і пачатку ранняга жалезнага веку.

Гарпу́н (§ 5) — кідальная зброя для палявання на звяроў і рыб.

Дали́на (§ 4) — роўная прастора ўздоўж ложа, па якім цячэ рака.

Да́та *(Ув.)* — гэта час, калі адбылася падзея.

Дзі́да (§ 1) — прылада працы ў выглядзе палкі, да якой прымацоўваўся востраканечнік, таксама кап'ё.

Звы́чай (§ 12) — правілы паводзін, якіх прытрымліваюцца людзі.

Індаеўрапе́йцы (§ 8) — плямёны жывёлаводаўвандроўнікаў, якія рассяліліся на вялікай тэрыторыі, у тым ліку і ў Еўропе. Пасля змешвання іх з мясцовым насельніцтвам утварыліся групы плямён: балты, славяне, германцы.

Курга́н (§ 13) — земляны насып над магілай памёршага.

Ледаві́к (§ 1) — лёд таўшчынёй да 2 км, які пакрываў зямную паверхню.

Маты́чнае земляро́бства (§ 9) — земляробства, пры якім апрацоўка зямлі ажыццяўлялася з дапамогай матыкі.

Мацяры́нскі род (§ 6) — абшчына, у якой роднасць яе членаў лічылася па жаночай лініі.

Мі́фы (§ 14) — вусныя апавяданні з фантастычнымі (неверагоднымі), дзівоснымі вобразамі.

Падсе́чна-агняво́е земляро́бства (§ 9) — земляробства, для вядзення якога высякаўся і спальваўся на адпаведным участку лес, карчаваліся пні, а попел служыў у якасці ўгнаення.

Палява́нне (§ 3) — пошук і праследаванне дзікіх звяроў і птушак з мэтай іх здабычы.

Печ-до́мніца (§ 10) — гліняная печ для атрымання з балотнай руды порыстай масы (крыцы) і крычнага жалеза.

Пле́мя (§ 6) — аб'яднанне некалькіх родаў, якія звязаны паміж сабой агульнасцю паходжання.

Праславя́не (§ 8) — агульныя продкі старажытных славян.

Прыро́дны падзе́л пра́цы (§ 3) — падзел працы паміж мужчынамі і жанчынамі, дарослымі і дзецьмі, маладымі і старымі.

Ро́давая аб-шчы́на (§ 6) — калектыў (невялікая група) старажытных людзей, якія звязаны паміж сабой сваёй роднасцю, агульнасцю паходжання і вядуць агульную гаспадарку.

Рэлі́гія (§ 7) — уяўленне старажытных людзей аб звышнатуральных сілах, якія існуюць у прыродзе.

Скульпту́ра (§ 7) — від мастацтва, які звязаны са стварэннем аб'ёмнага вобраза.

Спажыве́цкая (або прысво́йваючая) гаспада́рка (§ 5) — такі від гаспадаркі, пры якім старажытны чалавек браў ад прыроды ўсё ў гатовым выглядзе.

Старэ́йшына (§ 6) — кіраўнік роду або племені, самы вопытны і звычайна сталы чалавек.

Стая́нка (§ 2) — месца пасялення першабытнага чалавека.

Чо́вен (§ 5) — лодка, выдзеўбаная з суцэльнага ствала дрэва.

Э́ра *(Ув.)* — момант, з якога вядзецца летазлічэнне, а таксама само летазлічэнне. Дастаткова працяглы прамежак часу.

Літаратура для пазакласнага чытання

Кнігі да раздзела I

Маўр Я. Чалавек ідзе. Мн., 1989.

Аповесць напісана ў форме цікавай экскурсіі ў глыбіню вякоў, калі чалавек робіць першыя крокі на світанку сваёй гісторыі.

Чарняўскі М. М. Страла Расамахі. Мн., 1985.

Кніжка прызначана для юных чытачоў. У выглядзе кароткіх нарысаў расказваецца пра розныя здарэнні і падзеі з жыцця людзей каменнага веку: авалоданне агнём, паляванне, рыбалоўства, развіццё земляробства і жывёлагадоўлі. Нарысы напісаны на падставе археалагічных даследаванняў. Кніга мае цудоўныя ілюстрацыі.

Чарняўскі М. М. З глыбінь тысячагоддзяў. Мн., 1976.

У кнізе ў папулярнай форме апавядаецца пра жыццё чалавека на тэрыторыі Беларусі ў каменным веку, яго заняткі, побыт, вераванні, матэрыяльную культуру.

Караткевіч У. Зямля пад белымі крыламі: Нарыс. Мн., 1992. (Раздзел: «Праз дым стагоддзяў».)

Размова вядзецца пра прыроду нашай краіны, яе жывёльны і раслінны свет, пра фальклор і этнаграфію, пра сівую мінуўшчыну і сённяшні дзень.

Штыхаў Г.В. Галасы далёкіх продкаў. Мн., 1968.

Расказваецца аб захапляючых пошуках і незвычайных знаходках беларускіх археолагаў, аб паселішчах, якіх даўно няма, аб падзеях, што адбываліся калісьці на землях Беларусі.

Кнігі да раздзела II

Ненадавец А. М. Святло таямнічага вогнішча. Мн., 1993.

У кнізе прапануюцца артыкулы, прысвечаныя пакланенню людзей дрэвам і камяням, вужам і гадзюкам. Тут змешчаны аповеды пра Перуна і жывых прадвеснікаў лёсу: пеўня, зязюлю, крумкача і інш.

Чарняўскі М. М. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі. Мн., 1981.

У кнізе на аснове археалагічных раскопак старажытных помнікаў апавядаецца пра першабытна-абшчынны лад на тэрыторыі Беларусі ў эпоху з'яўлення першых металаў, распаўсюджання земляробства і жывёлагадоўлі.

Чарняўскі М. М. Вогнепаклоннікі. Мн., 1996.

У папулярных нарысах расказваецца аб жыцці старажытных людзей, прыладах працы, земляробстве, жывёлагадоўлі, зараджэнні духоўнай культуры.

Міфы Бацькаўшчыны /Склад. У. А. Васілевіч. Мн., 1994.

У кнізе паказаны народныя ўяўленні аб старажытных багах, нячысціках, якімі насяляў калісьці беларус сваё жыллё, наваколле і ўвесь свет. Прыводзіцца шмат вобразаў самабытнай беларускай міфалогіі.

Штыхаў Г. В. Ажываюць сівыя стагоддзі. Мн., 1974, 1982. (Раздзел: «Нямыя сведкі гісторыі».)

Юны чытач пазнаёміцца са шматлікімі археалагічнымі раскопкамі помнікаў ранняга жалезнага веку, у якіх прымалі ўдзел многія школьнікі Беларусі, з тым, як цікава праходзілі паходы па роднаму краю.

АСНОЎНЫЯ ДАТЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ

24 тыс. гадоў да н.э.	Найбольш старажытная стаянка чалавека ў Беларусі (в. Юравічы на Прыпяці, Калінкавіцкі раён)
21 тыс. гадоў да н.э.	Стаянка каменнага веку каля в. Бердыж на Сожы (Чачэрскі раён)
Каля 2000 г. да н.э.	Заканчэнне каменнага веку і пачатак бронзавага веку ў Беларусі
Каля 700 г. да н.э. — 500 г. н.э.	Жалезны век у Беларусі

ЗМЕСТ

Слова да вучняў 3
Як карыстацца падручнікам 4
Уводзіны. Датаванне падзей 8

Раздзел I

Жыхары на тэрыторыі Беларусі ў каменным веку

Тэма 1. Найстаражытнейшыя людзі 15
§ 1. Пранікненне людзей на тэрыторыю Беларусі ... —
§ 2. Першыя стаянкі людзей і іх побыт 19
§ 3. Заняткі старажытных жыхароў Беларусі 24
Тэма 2. Жыццё старажытных людзей у пасляледавіковы перыяд 29
§ 4. Паступовае засяленне тэрыторыі Беларусі ..... —
§ 5. Гаспадарчая дзейнасць 35
§ 6. Супольнасці людзей каменнага веку. Мацярынскі род 40
§ 7. Зараджэнне вераванняў і мастацтва ў людзей каменнага веку 44
Абагульненне да раздзела I 51

Раздзел II

Жыхары Беларусі ў бронзавым і жалезным вяках

Тэма 3. Старажытныя жывёлаводы і земляробы 55
§ 8. Рассяленне індаеўрапейскіх плямён ..... —
§ 9. Пераход ад спажывецкай да вытворчай гаспадаркі 60
§ 10. Роля металаў у жыцці старажытных людзей ... 68
§ 11. Утварэнне бацькоўскага роду 74
Тэма 4. Культура нашых продкаў 80
§ 12. Народныя вераванні і святы ..... —
§ 13. Бытавыя звычаі і абрады 86
§ 14. Развіццё старажытнага мастацтва 91
Абагульненне да раздзела II 97
Заключэнне 101
Тлумачальны слоўнік гістарычных паняццяў 102
Літаратура для пазакласнага чытання 107
Асноўныя даты па гісторыі Беларусі старажытных часоў 109

Вучэбнае выданне

Штыхаў Георгій Васільевіч
Пляшэвіч Уладзімір Канстанцінавіч
Фядута Вера Уладзіміраўна
Паноў Сяргей Веньямінавіч

Гісторыя Беларусі

старажытных часоў

Вучэбны дапаможнік для 4 класа
агульнаадукацыйнай школы
з беларускай і рускай мовамі навучання

2-е выданне

Рэдактар *Л. А. Цімафеева*. Вокладка мастака *Б. Г. Клюйко*. Мастацкія рэдактары *Р. С. Фралоў, Л. А. Дашкевіч*. Тэхнічныя рэдактары *М. І. Чаплавоцкая, З. У. Раманкевіч*. Камп'ютэрная вёрстка *Т. І. Галубец*. Карэктар *С. Т. Асташэвіч*.

Падпісана ў друк з дыяпазітываў 29.01.2002. Папера афсетная. Фармат 60x90$^{1}/_{16}$. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 7+0,25 форз. Умоўн. фарбаадбіт. 29. Ул.-выд. арк. 4,22+0,4 форз. Тыраж 146 600 экз. Заказ 413 .


Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Народная асвета»
Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку.
Ліцэнзія ЛВ № 4 ад 08.09.2000. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку».
220024, Мінск, Каржанеўскага, 20.

(Назва і нумар школы)


Навучальны год	Імя і прозвішча вучня	Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні	Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			

БРОНЗАВЫ ВЕК




Перыяд,
калі паяўляюцца
вырабы з медзі
і бронзы.
На Беларусі пачаўся
каля 2000 —
1800 гадоў да н. э.

ЖАЛЕЗНЫ ВЕК



Перыяд у гісторыі
чалавецтва,
калі людзі
навучыліся
здабываць жалеза.
На Беларусі пачаўся
каля 700 года да н. э.



ISBN 985-12-0548-6

9 789851 205482

«НАРОДНАЯ АСВЕТА»

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

4

2002